МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МАГІЛЕЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
імя А.А.КУЛЯШОВА

РУСКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК ХІМІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

(агульная і неарганічная хімія)

МАГІЛЕЎ 1998

Укладальнікі: Бузук Мікалай Пятровіч,
Палячонак Лідзія Дзмітрыеўна,
Ясінецкая Святлана Уладзіміраўна

Рэдактар: Лаўшук Аляксей Сцяпанавіч

Рэцэнзент: Канстанцінаў С.Г. кандыдат хімічных навук,
дацэнт кафедры хіміі Магілёўскага
хіміка-тэхналагічнага інстытута.

Слоўнік змяшчае пераклад тэрмінаў і наменклатуры па неарганічнай хіміі і, часткова, некаторыя паняцці сумежных з гэтай дысцыплінай навук. У сувязі з тым, што для часткі вучняў агульнаадукацыйнай школы існуюць пэўныя цяжкасці ў пастаноўцы тэрмінаў у родным склоне, аўтары падаюць гэтую форму ў прапануемым слоўніку. Дадзеная праца будзе добрым дапаможнікам для студэнтаў біялагічнага і хімічнага факультэтаў ВНУ і настаўнікаў сярэдняй школы.

ПРАДМОВА

Прапануемы слоўнік хімічных тэрмінаў з`яўляецца спробай укладальнікаў знізіць вастрыню адсутнасці беларускамоўных выданняў вучэбнага і вучэбна-метадычнага характару па хіміі. Ён адрасуецца і будзе, на наш погляд, карысным у першую чаргу вучням 8 -11 класаў агульнаадукацыйнай школы, якія вывучаюць курс "Неарганічная хімія". Акрамя таго, слоўнік патрэбны студэнтам ВНУ, якія вывучаюць курсы "Агульная хімія", "Неарганічная хімія", "Аналітычная хімія". Думаецца, што матэрыялы слоўніка паслужаць і на карысць настаўнікам хіміі, якія выкладаюць пералічаныя дысцыпліны ў школе, ПТВ, тэхнікумах і каледжах.

Асноўнае прызначэнне слоўніка - служыць агульнадаступным сродкам пры перакладзе хімічнай лексікі з рускай мовы на беларускую, а таксама садзейнічаць пашырэнню запасу спецыяльнай лексікі ў мове вучняў і студэнтаў.

Аб карыстанні слоўнікам

Структура прапануемага руска-беларускага слоўніка хімічнай тэрміналогіі пабудавана на алфавітна-гнездавой сістэме размяшчэння слоў. Слоўнікавыя артыкулы падаюцца ў алфавітным парадку. Гнездавая сістэма размяшчэння слоў дазваляе вытворныя ад агульнага кораня і блізкія па значэнні словы ўключаць у адзін слоўнікавы артыкул /гняздо/, калі гэта не пярэчыць алфавітнаму парадку ці не мяняе націску ў слове.

Умоўныя абазначэнні

Усе загалоўныя словы набраны вялікімі літарамі, таму напісанні з вялікай літары /уласныя назвы/ можна праверыць у беларускім адпаведніку /перакладным беларускім слове/, напрыклад:

ЗАКОН АВОГАДРО- закон Авагадра.

Агульная нязменная частка загалоўнага слова аддзяляецца дзвюма паралелькамі // ; у вытворным слове таго ж гнязда гэта нязменная частка слова абазначаецца знакам ~,напрыклад:

АБРАЗ//ИВ - абразіў, - зіва м.;~ИВНЫЙ - абразіўны; ~ ИВЫ-абразівы,-ваў мн.

Калі загалоўнае слова ў тэксце слоўнікавага артыкула паўтараецца поўнасцю, то яно па магчымасці замяняецца пачатковай літарай.

АДСОРБЕНТ - адсарбент, -ту м: а. пористый -адсарбент порыс-ты/сітаваты/.

Калі рускае слова ўжываецца толькі ў словазлучэнні, то пасля загалоўнага слова ставіцца двухкроп'е і падаецца адпаведнае словазлучэнне з яго перакладам на беларускую мову, напрыклад:

БЕЗЭЛЕКТРОДНЫЙ: разряд - безэлётродны разрад.

Ва ўсіх рускіх і беларускіх словах, за выключэннем аднаскладовых і з націскным Ё, ставіцца знак націску. У словах з двайным націскам абазначаюцца абодва націскі /АКВАМЕТРИЯ/. Калі пры скланенні беларускага адпаведніка націск пераходзіць на канчатак, то ён абазначаецца і ў форме роднага склону, якая прыводзіцца ў абавязковым парадку, напрыклад:

РУЧЕЙ - ручай,-чая м.

Калі частка вытворнага слова падаецца са сваім націскам, то гэта азначае, шо прапанаваны ў загалоўным слове націск губляе сваю сілу.

Розныя значэнні мнагазначнага слова выдзяляюцца лічбамі.

ВЗВЕШЕННЫЙ - 1.узважаны, паважаны; 2. завіслы, суспензавы.

Асноўным прынцыпам перакладу рускіх слоў у слоўніку з'яўляецца выбар найбольш дакладнага беларускага эквівалента для кожнага слова і яго значэння. Калі рускае слова ці яго значэнне мае некалькі беларускіх адпаведнікаў, то на першае месца вынесена больш блізкае па значэнні ці часцей ужывальнае ў мове слова. Блізкія па значэнні словы раздзяляюцца коскай, больш аддаленыя - кропкай з коскай, напрыклад:

ВОЗМОЖНОСТЬ - магчымасць,-ці ж, мажлівасць,- ці ж.

ВЗГЛЯД - позірк,- ку м; погляд,-ду м.

Усе зменныя часціны мовы ў слоўніку падаюцца ў пачатковай форме, за выключэннем выпадкаў, калі яны ўжываюцца толькі ў спецыфічных граматычных формах. Адзіночналікавыя і множналікавыя назоўнікі абавязкова суправаджаюцца адпаведнымі паметамі /адз.;мн./.

Пасля беларускіх перакладаў назоўнікаў указваецца форма роднага склону з апошнім нязменным зычным гукам асновы слова.Калі беларускі адпаведнік аднаскладовае слова ці мае ў родным склоне два напісанні, даецца поўная форма роднага склону.

КАЛИЙ - калій, -лію м;

ЙОД - ёд, ёду м.

Пасля перакладу назоўнікаў на беларускую мову за формай роднага склону робіцца памета аб форме роду гэтага назоўніка ў беларускай мове /м.,ж.,н./.

Крыніцамі нашага выдання з`яўляюцца:

1. Беларуска-рускі слоўнік, 2-е выд., т.т. 1-2. -Мн.: БелСЭ,1978;
2. Рудзитис Г.Е., Фельдман Ф.Г. Химия //Учебники для 8-11 классов средней школы.- М.: Просвещение, 1989-1993.
3. Русско-белорусский словарь, 2-е изд., т.т. 1-2.- Мн.:БелСЭ,1982.
4. Советский энциклопедический словарь.- М.: Советская энциклопедия, 1985.
5. Суворов А.В., Никольский А.Б. Общая химия. С-Пб: Химия, 1995.
6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы, т.т. 1-5.-Мн: БелСЭ 1977-1984.
7. Химическая экциклопедия, т.1.-М.: Совесткая энциклопедия,1988.
8. Химическая энциклопедия, т.3. - М.: Большая Российская Энциклопедия, 1992.
9. Химический словарь школьника /под ред. Б.Н.Кочергина. -Мн.:Народная асвета, 1990.
10. Химический энциклопедический словарь. -М.: Советская энциклопедия, 1983.

У наш слоўнік уключана каля 7000 рускамоўных лексічных адзінак, якія перакладаюцца беларускімі адпаведнікамі ці блізкімі па значэнні сродкамі.

Укладальнікі слоўніка будуць шчыра ўдзячнымі настаўнікам-прадметнікам і іншым зацікаўленым асобам за парады і прапановы па афармленні і зместу выдання.

Свае заўвагі просім дасылаць на адрас: 212022 г.Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1. Кафедра беларускай і рускай моў.

А

АБЕРРАЦИЯ -аберацыя, -цыі ж.

АБИЕТИН -абіяцін,-ну м; ~ОВЫЙ - абіяцінавы.

АБИОГ//ЕНЕЗ -абіягенез, -зу м;~ЕННЫЙ -абіягенавы.

АБРАЗ//ИВ - абразіў, -зіва м; ~ИВНЫЙ -абразіўны; ~ивные материалы -абразіўныя матэрыялы; ~ИВЫ- абразівы,-ваў мн.

АБРАЗИЯ -абразія, -зіі ж.

АБСОЛЮТ - абсалют, -ту м; ~НЫЙ - абсалютны; поўны; канчатковы; ~ный ноль - абсалютны нуль;~ный спирт - абсалютны спірт.

АБСОРБЕНТ - абсарбент, -ту м.

АБСОРБ//ЕР - абсорбер, -ра м;~ ИРОВАННЫЙ -абсарбаваны; ~ ИРОВАТЬ-абсарбаваць.

АБСОРБЦИОННЫЙ - абсарбцыйны.

АБСОРБЦИЯ - абсорбцыя, -цыі ж.

АВТОКАТАЛИЗ - аўтакаталіз, -зу м.

АВТОКАТАЛИТИЧЕС//КИЙ - аўтакаталітычны; ~ кая реакция-аўтакаталітычная рэакцыя.

АВТОЛ - аўтол, -лу м.

АВТОМАТИЗАЦИЯ - аўтаматызацыя, -цыі ж.

АВТОХРОМ - аўтахром, -му м;~ НЫЙ - аўтахромны.

АГРОХИМ//ИК - аграхімік, -ка м; ~ ИЧЕСКИЙ - аграхімічны; ~ИЯ -аграхімія, -міі ж; ~ ЛАБОРАТОРИЯ - аграхімлабараторыя, -рыі ж.

АДАМСИТ - адамсіт, -ту м.

АДГ//ЕЗИОННЫЙ - адгезійны;~ЕЗИЯ - адгезія, -зіі ж.

АДДУКТ - аддукт, -ту м.

АДИАБАТ//А - адыябата, -ты ж; ~ ИЧЕСКИЙ - адыябатычны; ~ическое расширение - адыябатычнае расшырэнне.

АДСОРБЕНТ - адсарбент, -ту м; а. пористый - адсарбент порысты /сітаваты/; а. природный - адсарбент прыродны; а. синтетический -адсарбент сінтэтычны

АДСОРБ//ЕР - адсорбер, -ра м;~ИРОВАННЫЙ -адсарбаваны; ~ИРОВАТЬ-адсарбаваць; ~ИРУЮЩИЙ - адсарбуючы; ~ирующие средства - адсарбуючыя сродкі.

АДСОРБЦИОН//НЫЙ - адсарбцыйны; ~ ная очистка - адсарбцыйная ачыстка; ~ные индикаторы - адсарбцыйныя індыкатары.

АДСОРБЦИЯ - адсорбцыя, -цыі ж.; а. избирательная - адсорбцыя-выбіральная; а. поверхностная - адсорбцыя паверхневая; а. физическая - адсорбцыя фізічная; а. химическая -адсорбцыя хімічная.

АЗЕОТРОП - азеатроп, -пу м; ~НЫЙ - азеатропны; ~ная смесь - азеатропная сумесь.

АЗИДЫ - азіды, -даў мн.

АЗОБЕНЗОЛ - азабензол, -лу м.

АЗОГРУППА - азагрупа, -пы ж.

АЗОКРАСИТЕЛЬ - азафарбавальнік, -ку м.

АЗОКСИСОЕДИНЕНИЕ - азаксізлучэнне, -ння н.

АЗОМЕТАН - азаметан, -ну м.

АЗОСОЕДИНЕНИЕ - азазлучэнне, -ння н.

АЗОСОЧЕТАНИЕ - азаспалучэнне, -ння н.

АЗОТ -азот, -ту м.

АЗОТОДОБЫВАЮЩИЙ - азотаздабываючы.

АЗОТ//ИЗАЦИЯ - азатызацыя, -цыі ж; ~ИРОВАНИЕ -азатаванне, -ння н;~ИРОВАННЫЙ - азатаваны; ~ИРОВАТЬ -азатаваць.

АЗОТИСТОВОДОРОД//НЫЙ - азоціставадародны;~ ная кислота -азоціставадародная кіслата.

АЗОТИСТОКИСЛЫЙ - азоцістакіслы.

АЗОТИСТ//ЫЙ - азоцісты; ~ая кислота - азоцістая кіслата

АЗОТНОВАТ//ИСТЫЙ - азатнавацісты; ~ЫЙ - азатнаваты.

АЗОТНО-ВОДОРОДНЫЙ - азотна-вадародны.

АЗОТНО-КАЛИЙНЫЙ - азотнакалійны.

АЗОТНОКИСЛЫЙ - азотнакіслы.

АЗОТНО-ТУКОВЫЙ - азотнатукавы; а. комбинат - азотнатукавы камбінат.

АЗОТНО-ФОСФОРНЫЙ - азотна-фосфарны.

АЗОТ//НЫЙ -азотны; ~ная кислота - азотная кіслата.

АЗОТОМЕТР - азатаметр, -ра м.

АЗОТОУСВАИВАЮЩИЙ - азотазасвойваючы.

АЗОТСОДЕРЖАЩИЙ - азотазмяшчальны.

АЗОТФИКС//АТОР - азотфіксатар, -ра м; ~АЦИЯ - азотфіксацыя,-цыі ж; ~ИРУЮЩИЙ - азотфіксуючы; ~ирующие микроорганизмы - азотфіксуючыя мікраарганізмы.

АЗУРИТ - азурыт, -ту м.

АЙРОЛ - айрол, -лу м.

АКАРИЦИД - акарыцыд, -ду м.

АКВАКОМПЛЕКС - аквакомплекс,-су м.

АКВАМЕТРИЯ - акваметрыя, -рыі ж.

АКВАСОЕДИНЕНИЕ - аквазлучэнне, -ння н.

АККУМУЛ//ИРОВАНИЕ - акумуляванне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - акумуляваць;~ИРУЮЩИЙ - акумулюючы; ~ЯТИВНЫЙ - акумулятыўны; ~ЯТОР -акумулятар, -ра м; ~ЯТОРНЫЙ - акумулятарны; ~яторная кислота -акумулятарная кіслата; ~ЯЦИЯ - акумуляцыя, -цыі ж.

АКОНИТОВ//ЫЙ - аканітавы; ~ая кислота - аканітавая кіслата.

АКРИДИН - акрыдзін, -ну м; ~ОВЫЙ - акрыдзінавы.

АКРИЛАТ -акрылат, -ту м; ~НЫЙ - акрылатавы, акрылатны.

АКРИЛОВ//ЫЙ - акрылавы; ~ая кислота -акрылавая кіслата.

АКРОЛЕИН - акралеін, -ну м.

АКСЕРОФТОЛ - аксерафтол, -лу м.

АКТИВ//АТОР -актыватар,-ру м; ~АЦИЯ - актывацыя,- цыі ж; ~ация молекул -актывацыя малекул; ~АЦИОННЫЙ - актывацыйны.

АКТИВИЗ//АТОР - актывізатар, -ра м; ~АЦИЯ -актывізацыя, -цыі ж;~ИРОВАТЬ - актывізаваць.

АКТИВИРОВА//НИЕ - актываванне, -ння н; ~ННЫЙ - актываваны; ~нный комплекс - актываваны комплекс; ~нный уголь - актываваны вугаль; ~ТЬ - актываваць.

АКТИВ//НОСТЬ - актыўнасць, -ці ж; ~ности металлов ряд - актыўнасці металаў рад.

АКТИН//ИЕВЫЙ - актыніевы; ~ИЙ -актыній, -нію м; ~ИЧЕСКИЙ -актынічны.

АКТИНОИД - актыноід, -ду м.

АКЦЕПТОР - акцэптар, -ра м; ~НЫЙ - акцэптарны.

АЛАНИН - аланін, -ну м.

АЛГОРИТМ - алгарытм, -му м.

АЛЕБАСТР - алебастр, -ру м; ~ОВЫЙ - алебастравы.

АЛИЗАРИН -алізарын. -ну м; ~ОВЫЙ - алізарынавы; ~овые красители - алізарынавыя фарбавальнікі.

АЛИФАТИЧЕС//КИЙ - аліфатычны; ~кие углеводороды - аліфатычныя вуглевадароды.

АЛИЦИКЛИЧЕСКИЙ - аліцыклічны.

АЛКАЛОИД - алкалоід, -ду м; ~НЫЙ - алкалоідны.

АЛЛОНЖ - алондж, -джу м.

АЛЛОТРОП//ИЧЕСКИЙ - алатрапічны; ~ИЯ - алатропія, -піі ж.

АЛМАЗ - алмаз, -зу м, дыямент, -ту м.

АЛХИМ//ИК - алхімік, -ка м; ~ИЧЕСКИЙ- алхімічны; ~ИЯ- алхімія,-міі ж.

АЛЬБУМИН - альбумін, -ну м; ~НЫЙ, ~ОВЫЙ - альбумінавы; ~ОИД-альбуміноід, -ду м.

АЛЬДЕГИД - альдэгід, -ду м; ~НЫЙ -альдэгідны.

АЛЮМЕЛЬ - алюмель, -лю м.

АЛЮМИНАТ - алюмінат, -ту м.

АЛЮМИН//ИЕВЫЙ - алюмініевы; ~ИЙ - алюміній, -нію м.

АЛЮМИНИЙОРГАНИЧЕС//КИЙ - алюмінійарганічны; ~кие соединения - алюмінійарганічныя злучэнні.

АЛЮМИНОТЕРМИЯ - алюмінатэрмія, -міі ж .

АЛЮМОСИЛИКАТ - алюмасілікат, -ту м.

АМАЛЬГАМА - амальгама, -мы ж.

АМАЛЬГАМИРОВАНИЕ - амальгамаванне, -ння н.

АМБРА -амбра,-ры ж.

АМЕРИЦИЙ - амерыцый, -цыю м.

АМЕТИСТ - аметыст, -ту м; ~ОВЫЙ -аметыставы.

АМИД - амід, -ду м.

АМИДОЛ - амідол, -лу м.

АМИЛ - аміл, -лу м; ~АЗА - аміласа, -зы ж.

АМИЛЕН - амілен, -ну м.

АМИЛНИТРИТ - амілнітрыт, -ту м.

АМИЛОВЫЙ - амілавы.

АМИЛОЗА - аміл оза,зы ж.

АМИЛОИД - аміл оід, -ду м.

АМИНОГРУППА - амінагрупа, -пы ж.

АМИНОКИСЛОТА - амінакіслата, -ты ж.

АМИНОСПИРТ - амінаспірт, -ту м.

АМИНО-УКСУС//НЫЙ - амінавоцатны; ~ная кислота - амінавоцатная кіслата.

АМИНЫ -аміны, -наў мн.

АМИТАЛ-НАТРИЙ - амітал-натрый, -рыю м.

АММИАК - аміяк, -ку м;~АТ - аміякат, -ту м.

АММИАЧНОКИСЛЫЙ - аміячнакіслы.

АММИАЧ//НЫЙ - аміячны; ~ная вода - аміячная вада.

АММОНАЛ -аманал, -лу м.

АММОН//ИЕВЫЙ - амоніевы; ~ИЗАЦИЯ - аманізацыя, -цыі ж;~ИЗИРОВАННЫЙ - аманізаваны; ~ИЗИРОВАТЬ - аманізаваць; ~ИЙ -амоній, -нію м,~ИЙНЫЙ -аманійны; ~ийные соли - аманійныя солі.

АММОНИЙФОСФАТ - амонійфасфат, -ту м.

АММОНИТ - аманіт, -ту м; ~НЫЙ - аманітавы, аманітны.

АММОНИФИКАЦИЯ - аманіфікацыя, -цыі ж.

АММОНОЛИЗ - аманоліз, -зу м.

АММОРФН//ОСТЬ - аморфнасць, -ці ж; ~ЫЙ - аморфны; ~ый осадок - аморфны асадак.

АММОТОЛ - аматол, -лу м.

АММОФОС - амафос, -су м.

АМПЕРОМЕТР//ИЧЕСКИЙ - ампераметрычны; ~ическое титрование - ампераметрычнае цітраванне; ~ИЯ - ампераметрыя, -рыі ж.

АМФОЛИТЫ - амфаліты, -таў мн.

АМФОТЕРН//ОСТЬ - амфатэрнасць, -ці ж; ~ЫЙ - амфатэрны; ~ый гидроксид - амфатэрны гідраксід;~ый оксид - амфатэрны аксід.

АНАБАЗИН -анабазін, -ну м.

АНАБОЛ//ИЗМ - анабалізм, -му м; ~ИЧЕСКИЙ - анабалічны; ~ические средства - анабалічныя сродкі.

АНАЛИЗ - аналіз, -зу м; а. количественный -аналіз колькасны; ~АТОР -аналізатар, -ра м; ~АТОРНЫЙ - аналізатарны; ~аторные средства - аналізатарныя сродкі;~АТОРСКИЙ - аналізатарскі; ~аторский приём - аналізатарскі прыём; ~ ИРОВАНИЕ - аналізаванне, -ння н; ~ИРОВАННЫЙ-аналізаваны; ~ИРОВАТЬ - аналізаваць.

АНАЛИТИЧЕС//КИЙ - аналітычны; ~кая химия - аналітычная хімія;~кое определение - аналітычнае азначэнне.

АНАЛОГ - аналаг, -га м; ~ИЗИРОВАТЬ - аналагізаваць; ~ИЧЕСКИЙ - аналагічны; ~ИЧНОСТЬ - аналагічнасць, -ці ж; ~ИЧНЫЙ - аналагічны;~ИЯ - аналогія, -гіі ж.

АНАЛОГО-ЦИФРОВОЙ - аналага-лічбавы.

АНГИДРИД - ангідрыд, -ду м; ~НЫЙ - ангідрыдны; ~ОВЫЙ - ангідрыдавы.

АНЕТОЛ - анетол, -лу м.

АНИЗОТРОП//ИЯ - анізатрапія, -піі ж; ~НОСТЬ - анізатропнасць, -ці ж; ~НЫЙ - анізатропны.

АНИЛИН - анілін, -ну м; ~ОВЫЙ - анілінавы.

АНИЛОКРАСИТЕЛЬ - аніла-фарбавальнік , -ку м.

АНИОН - аніён, -ну м; ~ИТ - аніяніт, -ту м.

АНИОНООБМЕН - аніёнаабмен, -ну м; ~НЫЙ - аніёнаабменны; ~ные смолы - аніёнаабменныя смолы.

АНОД - анод, -да м; ~ИРОВАНИЕ - анадзіраванне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - анадзіраваць; ~ИРОВАННЫЙ - анадзіраваны; ~НЫЙ -анодны;~ный процесс - анодны працэс.

АНОМАЛ//ИЯ - анамалія, -ліі ж; ~ЬНЫЙ - анамальны; ~ьное явление-анамальная з'ява.

АНТИБИОТ//ИК -антыбіётык, -ку м; ~ИЧЕСКИЙ - антыбіятычны.

АНТИДЕТОНА//ТОР - антыдэтанатар, -ра м; ~ЦИОННЫЙ - антыдэтанацыйны.

АНТИКАТАЛИЗАТОР - антыкаталізатар, -ра м.

АНТИКОАГУЛЯНТ - антыкаагулянт, -ту м.

АНТИМОНИД - антыманід, -ду м.

АНТИМОНИЙ - (уст.) сурма, -мы ж.

АНТИОКИСЛИТЕЛЬ - антыакісляльнік, -ку м.

АНТИПИРЕН - антыпірэн, -ну м.

АНТИМОНАТ - антыманат, -ту м.

АНТИМОНИТ - антыманіт, -ту м.

АНТИОКСИДАНТ - антыаксідант, -ту м.

АНТИПАРАЛЛЕЛЬНЫЙ - антыпаралельны.

АНТИПИРЕН - антыпірэн, -ну м.

АНТИРАСТВОРИТЕЛЬ - антырастваральнік, -ку м.

АНТИСЕПТ//ИК - антысептык, -ку м; ~ИЧЕСКИЙ - антысептычны.

АНТИСТАТИК - антыстатык, -ку м.

АНТИФЕБРИН - антыфебрын, -ну м.

АНТИФРИЗ - антыфрыз, -зу м; ~НЫЙ - антыфрызны; ~ный раствор - антыфрызны раствор.

АНТИХЛОР - антыхлор, -ру м.

АНТОХЛОР - антахлор, -ру м.

АНТОЦИАН - антацыян, -ну м.

АНТРАЦЕН - антрацэн, -ну м; ~ОВЫЙ -антрацэнавы;~овое масло - антрацэнавае масла.

АНТРАЦИТ - антрацыт, -ту м; ~НЫЙ - антрацытны; ~ОВЫЙ - антрацытавы.

АПАТИТ - апатыт, -ту м; ~ОВЫЙ - апатытавы.

АППАРАТ - апарат, -та м; а. Киппа - Кіпаў апарат; ~НЫЙ - апаратны;~ное оформление - апаратнае афармленне; ~УРА - апаратура, -ры ж;~УРНЫЙ - апаратурны.

АРАХИДОНОВ//ЫЙ - арахідонавы; ~ая кислота - арахідонавая кіслата.

АРБУТИН - арбуцін, -ну м.

АРГЕНТОМЕТРИЯ - аргентаметрыя, -рыі ж.

АРГИНИН - аргінін, -ну м.

АРГОН - аргон, -ну м; ~НЫЙ - аргонны;~ОВЫЙ - аргонавы.

АРМИРОВАН//ИЕ - арміраванне, -ння н; ~НЫЙ - арміраваны; ~ное стекло - арміраванае шкло.

АРОМАТ - духмянасць, -ці ж; пах, -ху м, водар, -ру м.

АРОМАТИ//ЗАТОР - араматызатар, -ра м; ~ЗАЦИЯ - араматызацыя, -цыі ж; ~ЧЕСКИЙ - араматычны, духмяны, пахучы, водарны; ~ческие углеводороды - араматычныя вуглевадароды; ~ЧНОСТЬ - духмянасць,-ці ж, водарнасць, -ці ж.

АРСЕНАТ - арсенат, -ту м.

АРСЕНИД - арсенід, -ду м.

АРСЕНИТ - арсеніт, -ту м.

АРСЕНОПИРИТ - арсенапірыт, -ту м.

АРСИН - арсін, -ну м.

АСБЕСТ - азбест, -ту м; ~ОВЫЙ, ~НЫЙ - азбеставы.

АСБЕСТООБОГАТИТЕЛЬНЫЙ - азбестаабагачальны.

АСКАНИТ - асканіт, -ту м.

АСКАРБИНОМЕТРИЯ - аскарбінаметрыя, -рыі ж.

АСКОРБИН - аскарбін, -ну м; ~ОВЫЙ - аскарбінавы; ~овая кислота -аскарбінавая кіслата.

АССИМЕТР//ИЧЕСКИЙ - ~ИЧНЫЙ - асіметрычны; ~чный атом -асіметрычны атам; ~ИЯ - асіметрыя, -рыі ж.

АССИМИЛ//ИРОВАННЫЙ - асіміляваны; ~ИРОВАТЬ - асіміляваць; ~ЯТОР -асімілятар, -ра м; ~ЯЦИЯ - асіміляцыя, -цыі ж.

АССОЦИ//АЦИЯ - асацыяцыя, -цыі ж; ~ИРОВАННЫЙ - асацыяваны;~ИРОВАТЬ - асацыяваць; ~ИРОВАТЬСЯ -асацыявацца.

АСТАТ - астат, -ту м.

АСТРАЛИТ - астраліт, -ту м.

АСФАЛЬТ - асфальт , -ту м; ~ИРОВАНИЕ - асфальтаванне , -ння н;~ИРОВАННЫЙ - асфальтаваны; ~ИРОВАТЬ - асфальтаваць.

АСФАЛЬТИТ - асфальтыт, -ту м.

АТМОСФЕР//А - атмасфера, -ры ж; ~НЫЙ - атмасферны; ~ная коррозия- атмасферная карозія; ~ная углекислота - атмасферная вуглекіслата; ~ный азот - атмасферны азот; ~ный кислород - атмасферны кісларод.

АТМОСФЕРОУСТОЙЧИВ//ОСТЬ - атмасфераўстойлівасць, -ці ж; ~ЫЙ -атмасфераўстойлівы; ~ый сплав - атмасфераўстойлівы сплаў.

АТОМ - атам, -му м; ~ИСТИКА - атамістыка, -кі ж.

АТОМНО-ВОДОРОДНЫЙ - атамна-вадародны.

АТОМНО-МОЛЕКУЛЯР//НЫЙ - атамна-малекулярны; ~ное учение -атамна-малекулярнае вучэнне.

АТОМН//ОСТЬ - атамнасць, -ці ж; ~ЫЙ - атамны; ~ая энергия - атамная энергія; ~ая масса - атамная маса; ~ое ядро - атамнае ядро; ~ый радиус - атамны радыус; ~ый спектр - атамны спектр.

АЦЕТАЛЬ - ацэталь , -лю м.

АЦЕТАТ - ацэтат, -ту м; ~НЫЙ - ацэтатны; ~ные волокна - ацэтатныя валокны.

АЦЕТИЛ -ацэтыл ,-лу м.

АЦЕТИЛЕН - ацэтылен, -ну м; ~ИДЫ - ацэтыленіды, -даў мн;~ОВЫЙ- ацэтыленавы.

АЦЕТИЛХЛОРИД - ацэтылхларыд, -ду м.

АЦЕТИЛЦЕЛЛЮЛОЗА - ацэтылцэлюлоза, -зы ж.

АЦЕТИЛЬНЫЙ - ацэтыльны.

АЦЕТОН - ацэтон, -ну м; ~ОВЫЙ - ацэтонавы.

АЦИЛИРОВА//НИЕ - ацыляванне, -ння н; ~ННЫЙ - ацыляваны;~ТЬ -ацыляваць.

АЭРОЗОЛЬ - аэразоль, -лі ж; ~НЫЙ - аэразольны; ~ная упаковка -аэразольная ўпакоўка.

Б

БАББИТ - бабіт, -ту м; ~НЫЙ - бабітны; ~ОВЫЙ - бабітавы.

БАКТЕРИЦИД - бактэрыцыд, -ду м; ~НЫЙ - бактэрыцыдны.

БАНКА - банка, -кі ж; слоік, -ка м; бляшанка, -кі ж.

БАНЯ - лазня, -ні ж; баня, -ні ж; б. водная - баня вадзяная; б. масляная - баня масленая; б. песчаная - баня пясчаная.

БАР//ИЕВЫЙ - барыевы; ~ИЙ - барый, -рыю м.

БАРОМЕТР - барометр, -ра м; ~ИЧЕСКИЙ -бараметрычны.

БАРЬЕР - бар'ер ; -ра м; б. активации - бар'ер актывацыі;б. энергетический - бар'ер энергетычны; ~НЫЙ -бар'ерны.

БАТАРЕЙКА - батарэйка, -кі ж.

БДИТЕЛЬН//ОСТЬ - пільнасць, -ці ж; ~ЫЙ - пільны.

БЕЗАЛКАЛОИДНЫЙ - безалкалоідны.

БЕЗАТОМНЫЙ - бязатамны.

БЕЗВОДНЫЙ - бязводны.

БЕЗВРЕДН//О - няшкодна, бясшкодна; ~ОСТЬ - няшкоднасць, -ці ж,бясшкоднасць, -ці ж; ~ЫЙ - няшкодны, бясшкодны.

БЕЗГРАНИЧН//О - бязмежна, бяскрайне; ~ОСТЬ -бязмежнасць, -ці ж,бяскрайнасць, -ці ж; ~ЫЙ - бязмежны, бяскрайні.

БЕЗЗОЛЬНЫЙ -бяззольны.

БЕЗОКИСЛИТЕЛЬНЫЙ - безакісляльны.

БЕЗОПАСН//О - бяспечна; ~ОСТЬ - бяспечнасць, -ці ж, бяспека, -кі ж; ~ЫЙ - бяспечны.

БЕЗОСНОВАТЕЛЬН//О - беспадстаўна; ~ОСТЬ - беспадстаўнасць, - ці ж; ~ЫЙ - беспадстаўны.

БЕЗОСТАНОВОЧНО - безупынна, без упынку, няспынна.

БЕЗОТНОСИТЕЛЬН//О - 1. безадносна; 2. незалежна; б.к величине и весу - незалежна ад велічыні і вагі; ~ОСТЬ - безадноснасць, -ці ж; ~ЫЙ - безадносны.

БЕЗОШИБОЧН//О - беспамылкова; ~ОСТЬ - беспамылковасць, - ці ж; ~ЫЙ- беспамылковы.

БЕЗРАЗЛИЧ//ИЕ абыякавасць, - ці ж; ~НО - абыякава; ~НЫЙ - 1.абыякавы; 2. нейтральны.

БЕЗРАЗМЕР//НЫЙ - безразмерны, беспамерны; ~ная величина - безразмерная велічыня.

БЕЗРЕЗУЛЬТАТН//О - безвынікова, безрэзультатна; ~ОСТЬ- безвыніковасць, -ці ж, безрэзультатнасць, -ці ж; ~ЫЙ - безвыніковы, безрэзультатны.

БЕЗУГАРНЫЙ - бясчадны.

БЕЗУДЕРЖН//О - нястрымна; ~ЫЙ - нястрымны.

БЕЗУКОРИЗНЕНН/О - беззаганна, бездакорна; ~ОСТЬ - беззаганнасць,-ці ж, бездакорнасць, -ці ж; ~ЫЙ - беззаганны, бездакорны.

БЕЗУСЛОВНО - безумоўна; вядома.

БЕЗУСПЕШНО - беспаспяхова, без поспеху; дарэмна, марна.

БЕЗЭЛЕКТРОДНЫЙ: - б. разряд - безэлектродны разрад.

БЕЛЕСОВАТ//ОСТЬ - бялявасць, -ці ж; ~ЫЙ - белаваты.

БЕЛИЛ//А - бялілы, -лаў мн; ~ЬНЫЙ - бялільны; ~ьная известь -бялільная вапна.

БЕЛКОВИНА -белкавіна, -ны ж.

БЕЛ//ОК - бялок, -ка і -ку м; ~КОВЫЙ - бялковы.

БЕНЗИЛ - бензіл, -лу м; ~ОВЫЙ - бензілавы; ~овый спирт - бензілавы спірт.

БЕНЗИН - бензін, -ну м; ~ОВЫЙ - бензінавы.

БЕНЗОИН - бензаін, -ну м; ~ОВЫЙ - бензаінавы.

БЕНЗОЙ//НЫЙ - бензойны; ~ная кислота - бензойная кіслата.

БЕНЗОЛ - бензол, -лу м; ~ОВЫЙ - бензолавы.

БЕНЗОНАФТОЛ - бензанафтол, -лу м.

БЕРЕЖЛИВ//О - беражліва, ашчадна, эканомна; ~ОСТЬ - беражлівасць,-ці ж, ашчаднасць, -ці ж, эканомнасць, -ці ж.

БЕРЕЖНО - асцярожна, беражліва, клапатліва.

БЕРЕЧЬ - 1. хаваць, захоўваць; б. от огня - захоўваць ад агню; 2. берагчы, ашчаджаць; б. время - берагчы час; 3. шанаваць, берагчы; б.как зеницу ока - берагчы /шанаваць/ як зрэнку вока.

БЕРИЛ//ИЕВЫЙ - берыліевы; ~ИЙ -берылій, -лію м.

БЕРТОЛЕТОВ - ~а соль, ~ая соль - берталетава соль.

БЕСКИСЛОРОДНЫЙ - бескіслародны.

БЕСКОНЕЧН//О - бясконца; ~ОСТЬ - 1. бясконцасць, -ці ж; бязмежнасць, -ці ж; бяскрайнасць, -ці ж; 2. бесканечнасць, -ці ж;~ЫЙ - 1. бясконцы; бязмежны; бяскрайні; 2. бесканечны.

БЕСПЕРСПЕКТИВН//ОСТЬ - бесперспектыўнасць, -ці ж; ~ЫЙ - бесперспектыўны.

БЕСПОЛЕЗНО - 1.бескарысна; 2. дарэмна, марна.

БЕСПОРЯДОК - беспарадак, -дку м, непарадак, -дку м; бязладдзе,-ддзя н.

БЕСПОРЯДОЧН//О -1.бязладна, хаатычна; 2. неакуратна, неахайна; ~ЫЙ - 1. бязладны, хаатычны; ~ое движение - хаатычны /бязладны/ рух.

БЕСПОЧВЕННЫЙ - неабгрунтаваны, беспадстаўны, безгрунтоўны.

БЕСПРЕДЕЛЬН//О - бязмежна; ~ОСТЬ - бязмежнасць, -ці ж; ~ЫЙ - бязмежны.

БЕСПРЕМЕНН//О - абавязкова; ~ЫЙ - абавязковы.

БЕСПРЕПЯТСТВЕНН//О - бесперашкодна; вольна, свабодна; ~ЫЙ - бесперашкодны; вольны, свабодны.

БЕСПРЕРЫВНЫЙ - бесперапынны, безупынны, няспынны.

БЕСПРИМЕСНЫЙ - бяспрымесны.

БЕССВЯЗНЫЙ - бязладны, нясkладны, без сувязі.

БЫСТРОРАСТВОРИМЫЙ - хуткараствараральны.

БЫСТРОТА - хуткасць, -ці ж; шпаркасць, -ці ж; быстрыня, -ні ж.

БЫСТРОТЕЧНОСТЬ - скарацечнасць, -ці ж; хуткацечнасць, -ці ж, хуткабежнасць, -ці ж.

БЮРЕТКА - бюрэтка, -кі ж.

В

ВАЗЕЛИН - вазелін, -ну м; ~ОВЫЙ - вазелінавы.

ВАКАН//СИЯ - вакансія, -сіі , ж; ~ТНЫЙ - вакантны, пусты.

ВАКУУМ - вакуум, -му м; ~ИРОВАНИЕ - вакуумаванне, -ння н;~ИРОВАТЬ -вакуумаваць; ~-КАМЕРА -вакуум-камера, -ры ж; ~НЫЙ -вакуумны.

ВАЛЕНТН//ОСТЬ - валентнасць, -ці ж; ~ЫЙ - валентны; ~ый угол - валентны вугал.

ВАНАДАТ - ванадат, -ту м; ~ОМЕТРИЯ - ванадатаметрыя, -рыі ж.

ВАНАД//ИЕВЫЙ - ванадыевы; ~иевые бронзы - ванадыевыя бронзы;~иевые катализаторы - ванадыевыя каталізатары; ~ИЙ - ванадый,-дыю м.

ВАНН//А - ванна, -нны ж; в. электролитическая - ванна электралітычная; ~ЫЙ - ванны.

ВАРИАНТ - варыянт, -та м; ~НОСТЬ - варыянтнасць, -ці ж; ~НЫЙ -варыянтны.

ВАТМАН - ватман, -ну м; ~ская бумага - ватманская папера.

ВБЛИЗИ - блізка, паблізу, зблізку; недалёка.

ВВЕДЕНИЕ -1. уводзіны, уводзін мн.; уступ, -пу м; 2. увядзенне,-ння н.

ВВОД - увод, -ду м; ~ИТЬ - уводзіць; ~ить в употребление - уводзіць ва ўжыванне; ~ить в действие - уводзіць у дзеянне; ~ить понятие - уводзіць паняцце;~ить газ - дабаўляць /дадаваць/ газ.

ВГЛУБЬ - углыб, углыбіню.

ВГЛЯДЫВАТЬСЯ - углядацца, узірацца.

ВДОВОЛЬ - удосталь; уволю.

ВДРЕБЕЗГИ - ушчэнт; разбить в.- разбіць у друзачкі /ушчэнт/.

ВДРУГ - раптам; ураз; разам; адразу; знянацку.

ВЕЗДЕ - усюды, скрозь.

ВЕЛИЧИНА - велічыня, -ні ж.

ВЕНТИЛ//Ь - вентыль, -ля м; ~ЯТОР -вентылятар, -ра м; ~ЯЦИОННЫЙ-вентыляцыйны; ~ЯЦИЯ - вентыляцыя, -цыі ж.

ВЕРН//ЫЙ - правільны, слушны; дакладны;~ое решение задачи - правільнае рашэнне задачы.

ВЕРОЯТН//ОСТЬ - імавернасць, -ці ж; праўдападобнасць, -ці ж; магчымасць, -ці ж; верагоднасць, -ці ж; ~ость нахождения электрона - верагоднасць знаходжання электрона; ~НЫЙ - імаверны; праўдападобны; магчымы; верагодны.

ВЕРТИКАЛЬ - вертыкаль, -лі ж; ~НО - вертыкальна; ~НОСТЬ - вертыкальнасць, -ці ж; ~НЫЙ - вертыкальны.

ВЕС - вага, -гі ж; удельный в. - удзельная вага; меры веса - меры вагі; ~ИТЬ - важыць; ~КИЙ- важкі; ~ОВОЙ - вагавы; ~овой анализ -вагавы аналіз; ~овая ком-

ната - вагавы пакой; важніца, -цы ж;~овые отношения - вагавыя адносіны.

ВЕСЫ - вагі, -гаў мн; шалі, -ляў мн.

ВЕСЬМА - вельмі, надта, дужа.

ВЕТВЬ - галіна, -ны ж; в. науки - галіна навукі.

ВЕЩЕСТВО - рэчыва, -ва н; матэрыя, -рыі ж; взрывчатое в. - выбуховае рэчыва; обмен веществ - абмен рэчываў.

ВЗАИМНО - узаемна.

ВЗАИМОВЛИЯ//НИЕ - узаемаўплыў, -лыву м; ~ТЬ - узаемаўплываць.

ВЗАИМОДЕЙСТВ//ИЕ - узаемадзеянне, -ння н; ~ие дисперсное-узаемадзеянне дысперснае; в. индукционное - узаемадзеянне індукцыйнае; в. межмолекулярное - узаемадзеянне міжмалекулярнае; в. ориентационное - узаемадзеянне арыентацыйнае; ~ОВАТЬ - узаемадзейнічаць; ~УЮЩИЙ - узаемадзейны.

ВЗАИМОЗАВИСИМ//ОСТЬ - узаемазалежнасць, -ці ж; ~ЫЙ - узаемазалежны.

ВЗАИМОЗАМЕНЯЕМ//ОСТЬ - узаемазамяняльнасць, -ці ж; ~ЫЙ -узаемазамяняльны.

ВЗАИМОИСКЛЮЧАЮЩИЙ - узаемавыключальны.

ВЗАИМООБМЕН - узаемаабмен, -ну м.

ВЗАИМООБОГАЩЕНИЕ - узаемаабагачэнне, -ння н.

ВЗАИМООБУСЛОВЛЕНН//ОСТЬ - узаемаабумоўленасць, -ці ж; ~ЫЙ - узаемаабумоўлены.

ВЗАИМООТНОШЕНИЯ - узаемаадносіны, -наў мн.

ВЗАИМООТТАЛКИВАНИЕ - узаемаадштурхоўванне, -ння н.

ВЗАИМОПРЕВРАЩЕНИЕ - узаемаператварэнне, -ння н.

ВЗАИМОПРОНИКНОВЕНИЕ - узаемапранікненне, -ння н.

ВЗАИМОСВЯЗАНН//ОСТЬ - узаемазвязанасць, -ці ж; ~ЫЙ - узаемазвязаны.

ВЗАИМОСВЯЗЬ - узаемасувязь, -зі ж.

ВЗАМЕН - узамен, наўзамен; замест.

ВЗБАЛАМУТИТЬ - ускаламуціць.

ВЗБАЛТЫВА//НИЕ - боўтанне, -ння н, узбоўтванне, -ння н; ~ТЬ - узбоўтваць.

ВЗБОЛТ//АННЫЙ - узбоўтаны; ~АТЬ - узбоўтаць.

ВЗБРЫЗГИВА//НИЕ - спрысkванне, -ння н; ~ТЬ - спрыскваць.

ВЗВЕСИТЬ - узважыць, паважыць.

ВЗВЕСЬ - завісь, -сі ж, суспензія, -зіі ж.

ВЗВЕШ//ЕННЫЙ - 1. узважаны, паважаны; 2. завіслы, суспензавы;~ИВАНИЕ - узважванне, -ння н, важанне, -ння н;~ИВАТЬ - узважваць.

ВЗГЛЯД - 1. позірк, -ку м; погляд, -ду м; 2. погляд, -ду м, думка, -кі ж; разделять чьи-либо взгляды - падзяляць чые-небудзь погляды /думкі/; высказать свой в. - выказаць свой погляд /сваю думку/.

ВЗМУТИТЬ - ускаламуціць, скаламуціць, змуціць.

ВЗМУЧЕННЫЙ - ускаламучаны, скаламучаны, замучаны, змучаны.

ВЗОРВАТЬ - узарваць; паўзрываць; падарваць; ~СЯ - узарвацца, выбухнуць; падарвацца; разбурыцца.

ВЗРЫВ - 1. выбух, -ху м; в. газа - выбух газу; 2. узрыў, узрыву м; в. установки- узрыў установкі; ~АНИЕ - узрыванне, -ння н;падрыванне, -ння н; разбурэнне, -ння н.

ВЗРЫВОБЕЗОПАСНЫЙ - выбуховабяспечны, узрывабяспечны.

ВЗРЫВООПАСНЫЙ - выбухованебяспечны, узрыванебяспечны.

ВЗРЫВЧАТ//ЫЙ - выбуховы, выбухны; ~ые вещества - выбуховыя рэчывы.

ВЗЯТЬ - узяць.

ВИД - выгляд, -ду м; шарообразный в. - шарападобны выгляд; ~ЕНИЕ - бачанне, -ння н; ~ЕННЫЙ - бачаны; ~ИМОСТЬ - 1. бачнасць, -ці ж; 2.выгляд, -ду м; только одна ~имость - толькі адзін выгляд, толькі так здаецца; по всей ~имости - як відаць; ~ИМЫЙ - 1. бачны; 2.прыметны, прыкметны; яўны; відавочны; ~имый результат - відавочны /прыметны/ вынік; 3. знешні, уяўны; паказны.

ВИЗУАЛЬН//О - візуальна;~ЫЙ - візуальны.

ВИНИЛ - вініл, -лу м.

ВИНИЛИТ - вініліт, -ту м.

ВИНИЛОВЫЙ - вінілавы;в. спирт - вінілавы спірт.

ВИНИЛХЛОРИД - вінілхларыд, -ду м.

ВИНИПЛАСТ - вініпласт, -ту м;~ОВЫЙ -вініпластавы.

ВИННЫЙ - вінны; в. спирт - вінны спірт.

ВИНТ - 1. шруба, -бы ж; 2. вінт, вінта м; ~ОМ - вінтом, спіраллю.

ВИСКОЗА - віскоза, -зы ж.

ВИСКОЗИМЕТРИЯ - віскозіметрыя, -рыі ж.

ВИСКОЗН//ЫЙ - віскозны; ~ое волокно - віскознае валакно.

ВИСМУТ - вісмут, -ту м.

ВИСМУТИД - вісмутыд, -ду м.

ВИСМУТ//НЫЙ, ~ОВЫЙ - вісмутавы.

ВИТАМИН - вітамін , -ну м; ~ИЗАЦИЯ - вітамінізацыя,-цыі ж; ~ИЗИРОВАННЫЙ - вітамінізаваны; ~ИЗИРОВАТЬ - вітамінізаваць; ~НЫЙ, ~ОВЫЙ - вітамінавы; ~ОЗНЫЙ - вітамінозны.

ВИТАМИНОСОДЕРЖАЩИЙ - вітаміназмяшчальны.

ВКЛЮЧ//АТЕЛЬ - уключальнік, -ка м; ~АТЬ - уключаць; ~АЯ - уключаючы; ~ЕНИЕ - уключэнне, -ння н; ~ЁННЫЙ - уключаны; ~ИТЕЛЬНО- уключна.

ВКРАПЛЕН//ИЕ - украпіна, -ны ж; ~ия золота - украпіны золата.

ВКУС - смак, смаку м; горький в. - горкі смак; кислый в. -кіслы смак; сладкий в. - салодкі смак; ~НЫЙ - смачны; ~ОВОЙ- смакавы.

ВЛАГА - вільгаць, -ці ж.

ВЛАГОВПИТЫВАЮЩИЙ - вільгацепаглынальны.

ВЛАГОПОГЛОТИТЕЛЬ - вільгацепаглынальнік, -ка м.

ВЛАЖН//О -вільготна; ~ОСТЬ - вільготнасць, -ці ж; ~ЫЙ -

вільготны; сыры, волкі, вогкі; мокры; ~ый воздух - вільготнае паветра.

ВЛАСТЕЛИН - уладар, -ра м; валадар, -ра м.

ВЛЕЧЕНИЕ - 1. цяга, -гі ж; 2. схільнасць, -ці ж; прыхільнасць,-ці ж.

ВЛИВА//НИЕ - уліванне, -ння н; ~ТЬ - уліваць.

ВЛИЯ//НИЕ - уплыў, -лыву м; поддаваться ~нию - паддавацца ўплыву; ~ТЬ - уплываць, рабіць уплыў; ~ть друг на друга - уплываць адзін на аднаго.

ВМЕСТЕ - разам; сумесна; супольна.

ВМЕСТИ//ЛИЩЕ - умяшчальня, -ні ж; ёмішча, -ча н; ~МОСТЬ - умяшчальнасць, -ці ж; ёмістасць, -ці ж; ~МЫЙ - умяшчальны; ~ТЕЛЬНОСТЬ - умяшчальнасць, -ці ж; ёмістасць, -ці ж; ~ТЕЛЬНЫЙ - умяшчальны;~ТЬ - умясціць, утоўпіць.

ВМЕЩ//АТЬ - змяшчаць, умяшчаць, утоўпліваць; ~АТЬСЯ - змяшчацца,умяшчацца, тоўпіцца; ~ЕНИЕ - змяшчэнне, -ння н, умяшчэнне, -ннян, утоўпліванне, -ння н.

ВНЕАТМОСФЕРНЫЙ - пазаатмасферны.

ВНЕДР//ЕНИЕ - укараненне, -ння н; ~ЁННЫЙ - укаранёны; ~ИТЬ - укараніць; ~ИТЬСЯ - укараніцца; ~ЯТЬ - укараняць; ~ЯТЬСЯ - укараняцца.

ВНЕЗАПН//О - раптам, раптоўна; знянацку, неспадзеўкі, неспадзявана; ~ОСТЬ - раптоўнасць, -ці ж; неспадзяванасць, -ці ж;~ЫЙ - раптоўны; неспадзяваны.

ВНЕШНИЙ - знешні; вонкавы; в. электрон - знешні электрон; в. энергетический уровень - вонкавы (знешні) энергетычны ўзровень.

ВНИМА//НИЕ - увага, -гі ж; ~ТЕЛЬНО - уважліва; ~ТЕЛЬНОСТЬ - уважлівасць, -ці ж; ~ ТЕЛЬНЫЙ -уважлівы; ~ТЬ - слухаць.

ВНУТРЕНН//ИЙ - унутраны; в. электрон - унутраны электрон; ~яя энергия - унутраная энергія.

ВНУТРИ - усярэдзіне; унутры.

ВНУТРИАТОМН//ЫЙ - унутрыатамны; ~ая энергия - унутрыатамная энергія.

ВНУТРИКОМПЛЕКСН//ЫЙ - унутрыкомплексны; ~ые соединения - унутрыкомплексныя злучэнні.

ВНУТРИМОЛЕКУЛЯРНЫЙ - унутрымалекулярны.

ВОВЛЕ//КАНИЕ - уцягванне, -ння н; залучэнне, -ння н, далучэнне,-ння н; ~КАТЬ -уцягваць; залучаць; ~КАТЬСЯ - уцягвацца; далучацца, залучацца; ~ЧЕНИЕ - уцягванне, -ння н, уцягненне, -ння н; далучэнне, -нняя н, залучэнне, -ння н; ~ЁННЫЙ - уцягнуты; далучаны, залучаны.

ВОВРЕМЯ - своечасова, у час, у пару.

ВОДА - вада, -ды ж; дистиллированная в. - дыстыляваная вада; жёсткая в. - жорсткая вада; мягкая в. - мяккая вада; тяжёлая в.- цяжкая вада.

ВОДНО-СОЛЕВОЙ - водна-салявы; в. раствор - водна-салявы раствор.

ВОДНЫЙ - водны.

ВОДОНЕПРОНИЦАЕМ//ОСТЬ - воданепранікальнасць, -ці ж; ~ЫЙ -воданепранікальны.

ВОДООПРЕСНИТЕЛЬ - водаапраснялыік, -ка м.

ВОДООТДЕЛИТЕЛЬ - водааддзельнік, -ка м.

ВОДООТНИМАЮ//ЩИЙ - водаадборны; водаадымальны; ~щие вещества -водаадымальныя рэчывы; ~щие средства - водаадборныя сродкі.

ВОДООЧИСТ//ИТЕЛЬ - водаачышчальнік, -ка м; ~ИТЕЛЬНЫЙ -водаачышчальны;~КА - водаачыстка, -кі ж.

ВОДОПРОВОДЯЩИЙ - водаправодзячы.

ВОДОПРОНИЦАЕМ//ОСТЬ - водапранікальнасць, -ці ж; ~ЫЙ - водапранікальны.

ВОДОРАСТВОРИМЫЙ - водараставаральны.

ВОДОРОД - вадарод, -ду м; ~ИСТЫЙ- вадародзісты; ~НЫЙ - вадародны;~ный показатель - вадародны паказчык; ~ный электрод - вадародны электрод; ~ная связь - вадародная сувязь.

ВОДОСОДЕРЖАЩИЙ - водазмяшчальны.

ВОДОСТРУЙНЫЙ - водаструменны; в. насос - водаструменная помпа.

ВОДЯНОЙ - вадзяны; в. газ - вадзяны газ; в. пар - вадзяная пара.

ВОЗБУЖДЕ//НИЕ - узбуджэнне, -ння н, абуджэнне, -ння н; в.электрона квантом - узбуджэнне электрона квантам; ~ННЫЙ - узбуджаны, абуджаны; ~нное состояние - абуджаны стан.

ВОЗВРАТ - зварот, -ту м; вяртанне, -ння н; ~ИТЬ - вярнуць; ~ИТЬСЯ - вярнуцца; ~НЫЙ - зваротны.

ВОЗГОН//КА - вазгонка, -кі, ж; ~ЯТЬ - вазганяць; ~ЯТЬСЯ - вазганяцца.

ВОЗГОРА//ЕМОСТЬ - узгаральнасць, -ці ж; ~ЕМЫЙ - узгаральны;~НИЕ -узгаранне, -ння н; ~ТЬСЯ - узгарацца, загарацца.

ВОЗДЕЙСТВ//ИЕ - уздзеянне, -ння н; уплыў, -лыву м; ~ОВАТЬ - уздзейнічаць, уплываць.

ВОЗДУХ - паветра, -ра н; ~ОВОД - паветравод, -да м.

ВОЗДУХООБМЕН - паветраабмен, -ну м.

ВОЗДУХООТДЕЛ//ЕНИЕ - паветрааддзяленне, -ння н; ~ИТЕЛЬ -паветрааддзельнік, -ка м.

ВОЗДУХОСБОРНИК - паветразборнік, -ка м.

ВОЗДУШНО-КИСЛОРОДНЫЙ - паветрана-кіслародны.

ВОЗЛЕ - побач, поруч; каля.

ВОЗМЕСТИ//ТЕЛЬ - кампенсатар, -ра м; ~ТЬ - кампенсаваць; вярнуць.

ВОЗМОЖН//ОСТЬ - магчымасць, -ці ж, мажлівасць, -ці ж; ~ЫЙ - магчымы, мажлівы.

ВОЗМУТИТЕЛЬ - падбухторшчык, -ка м; бунтаўшчык, -ка м; парушальнік, -ка м.

ВОЗНИК//АТЬ - узнікаць, вынікаць, паўставаць; ~НОВЕНИЕ - узнікненне, -ння н; ~НУТЬ - узнікнуць, вынікнуць, паўстаць.

ВОЗОБЛАДАТЬ - атрымаць перавагу, узяць верх, запанаваць; перамагчы, пераадолець.

ВОЗОБНОВ//ИТЬ - аднавіць; ~ИТЬСЯ - аднавіцца; ~ЛЕНИЕ - аднаўленне, -ння н; ~ЛЕННЫЙ - адноўлены.

ВОЗРАСТ//АНИЕ - узрастанне, -ння н; ~АТЬ - узрастаць.

ВОЛН//А - хваля, -лі ж; теория волн - тэорыя хваль; ~ОВОЙ - хвалевы; ~овая природа электрона - хвалевая прырода электрона; ~овая функция - хвалевая функцыя.

ВОЛОКНО - валакно, -на н; в. природное -валакно натуральнае /прыроднае/; в. синтетическое - валакно сінтэтычнае.

ВОЛЬФРАМ - вальфрам, -му м.

ВОЛЬФРАМАТ - вальфрамат, -ту м.

ВОЛЬФРАМИТ - вальфраміт, -ту м.

ВОЛЬФРАМОВ//ЫЙ - вальфра́мавы; ~ая кислота - вальфрамавая кіслата.

ВОРОНКА - лейка, -кі ж; в. делительная - лейка дзялільная; в. капельная - лейка кропельная.

ВОСК - воск, воску м; горный в. - горны воск.

ВОСКООБРАЗНЫЙ - воскападобны.

ВОСПЛАМЕН//ЕНИЕ - запальванне, -ння н; загаранне, -ння н,загарванне, -ння н; узгаранне, -ння н, узгарванне, -ння н; ~ИТЬ - запаліць; ~ИТЬСЯ - загарэцца, узгарэцца;успыхнуць; ~ЯЕМОСТЬ - узгаральнасць, -ці ж; ~ЯТЬ - запальваць; ~ЯТЬСЯ- загарацца,загарвацца, узгарацца, узгарвацца; ~ЯЮЩИЙСЯ - лёгкаўзгаральны.

ВОСПОЛНЕН//ИЕ - папаўненне, -ння н, запаўненне, -ння н; дапаўненне, -ння н; ~НЫЙ - папоўнены, запоўнены; дапоўнены.

ВОСПРОИЗВ//ЕДЕНИЕ - узнаўленне, -ння н; аднаўленне, -ння н;в.результатов - узнаўленне вынікаў; в. условий - узнаўленне ўмоў; ~ЕДЁННЫЙ - узноўлены; адноўлены; ~ОДИТЬ -узнаўляць; аднаўляць.

ВОСПРОИЗВОДИМОСТЬ - узнаўляльнасць, -ці ж; аднаўляльнасць, -ці ж.

ВОССТАН//АВЛИВАТЬ - аднаўляць; вяртаць; ~ АВЛИВАТЬСЯ - аднаўляцца; вяртацца; ~ОВИТЕЛЬ - адноўнік, -ка м; ~ОВИТЕЛЬНЫЙ - аднаўленчы; ~овительный процесс - аднаўленчы працэс; ~ОВЛЕНИЕ - аднаўленне,-ння н; вяртанне, -ння н.

ВПИТЫВА//НИЕ - убіранне, -ння н; усмоктванне, -ння н; уцягванне,-ння н; ~ТЬ - убіраць; усмоктваць; ~ТЬСЯ - убірацца, усмоктвацца; пранікаць.

ВПОЛНЕ - цалкам.

ВПОСЛЕДСТВИИ - пасля; пазней; у далейшым.

ВПРЫС//КИВАНИЕ - упырскванне,-ння, н; ~КИВАТЬ - упырскваць; ~НУТЫЙ - упырскнуты; ~НУТЬ - упырскнуць.

ВРАЩ//АТЬ - круціць; варочаць; вярцець; ~ЕНИЕ - кручэнне, -ння н;варочанне, -ння н; вярчэнне, -ння н; ~ение молекул - вярчэнне малекул.

ВРЕД - шкода, -ды ж; ~ИТЬ - шкодзіць; ~НОСТЬ - шкоднасць, -ці ж;~НЫЙ - шкодны.

ВРЕМЯ - час, -су м; в. жизни частицы - час існавання часціцы.

ВРОВЕНЬ - роўна, упоравень.

ВСАСЫВА//НИЕ - усмоктванне, -ння н; ~ТЬ - усмоктваць; ~ЮЩИЙ -усмоктвальны.

ВСЕГДА - заўсёды, заўжды.

ВСЕСТОРОНН//Е - усебакова; ~ИЙ - усебаковы.

ВСЛЕДСТВИЕ - з прычыны.

ВСПЛЫ//ВАНИЕ - усплыванне, -ння н; ~ВАТЬ - усплываць; ~ТИЕ -усплыванне, -ння н; ~ТЬ - усплысці, усплыць.

ВСПЫ//ХИВАНИЕ - успыхванне, -ння н; загаранне, -ння н; ~ХИВАТЬ -успыхваць; загарацца, шугаць; ~ХНУТЬ - успыхнуць; загарэцца,шугануць; ~ШКА - успышка, -кі ж.

ВСТРЕЧАТЬ - сустракаць; натрапляць; ~СЯ - сустракацца; трапляцца.

ВСТРЯХ//ИВАНИЕ - падтрэсванне,-ння н; устрэсванне, -ння н; ~ИВАТЬ- трэсці, падтрасаць, падтрэсваць; ~НУТЫЙ - страсянуты, скалануты; ~ НУТЬ - страсянуць, скалануць.

ВСТУП//АТЬ - уступаць; уваходзіць; в. в реакцию - уступаць у рэакцыю; ~ИТЬ уступіць; увайсці.

ВТОРИЧН//ЫЙ - другасны; другарадны; паўторны; в. амин - другасны амін; в. спирт - другасны спірт; в. атом углерода - другасны атам вугляроду; ~ые признаки - другасныя адзнакі /прыметы/.

ВХОДИТЬ - уваходзіць; в. в состав чего-л. - уваходзіць у састаў чаго-небудзь.

ВЫБРЫЗГИВАНИЕ - выпырскванне, -ння н.

ВЫВАЛИВАТЬ - вывальваць, выкідаць, выкідваць, выварочваць,выкульваць.

ВЫВЕШИВАНИЕ - выважванне, -ння н.

ВЫВОД - вывад, -ду м; вынік, -ку м; в. формулы - вывад формулы; ~ИТЬ - выводзіць; ~ить формулу - выводзіць формулу.

ВЫГЛЯДЕТЬ - выглядаць.

ВЫГОНКА - выганка, -кі ж.

ВЫДЕЛ//ЕНИЕ - вылучэнне, -ння н; в. тепла - вылучэнне цеплыні;~ЯТЬ - вылучаць; ~ЯТЬСЯ - вылучацца; ~яется газ - вылучаецца газ.

ВЫДЕРЖИВА//НИЕ - вытрымліванне, -ння н; ~ТЬ - вытрымліваць.

ВЫЖИГ - выпальванне, -ння н; в. кокса - выпальванне коксу.

ВЫКИПА//НИЕ - выкіпанне, -ння н; ~ТЬ - выкіпаць.

ВЫКРИСТАЛЛИЗ//ОВАННЫЙ - выкрышталізаваны; ~ОВАТЬ - выкрышталізаваць; ~ОВАТЬСЯ - выкрышталізавацца; ~ ОВЫВАНИЕ -выкрышталізоўванне, -ння н; ~ОВЫВАТЬ - выкрышталізоўваць.

ВЫЛИВАНИЕ - выліванне, -ння н, адліванне, -ння н.

ВЫПАД//АНИЕ - выпаданне, -ння н; ~АТЬ - выпадаць; ~ЕНИЕ - выпаданне, -ння н.

ВЫПАРИВА//НИЕ - выпарванне, -ння н; ~ТЬ - выпарваць.

ВЫПОЛН//ЕНИЕ - выкананне, -ння, н; ~ЕННЫЙ - выкананы; ~ИТЕЛЬ -выканаўца, -цы м; ~ИТЬ -выканаць; зрабіць; ~ЯТЬ выконваць; рабіць.

ВЫПРЯМИ́ТЕЛЬ - выпрамні́к, -ка́ м; ~НЫЙ - выпрамля́льны.

ВЫРА́ВНИВ//АНИЕ - выраўно́ўванне, -ння н; ~АТЕЛЬ - выраўно́ўвальнік,-ка м; ~АТЬ - выраўно́ўваць; ~АТЬСЯ - выраўно́ўвацца.

ВЫ́РАВНЯТЬ - ураўнава́ць.

ВЫРАЖ//А́ТЬ - 1. выяўля́ць; пака́зваць; перадава́ць; адлюстро́ўваць; 2. выража́ць; ~Е́НИЕ -1. выяўле́нне; -ння н; пака́з, - зу м;перада́ча, -чы ж; 2. вы́раз, -зу м; 3. выражэ́нне, -ння н; ~ЕННЫЙ - 1. вы́яўлены; пака́заны; перада́дзены; адлюстрава́ны; 2. вы́ражаны.

ВЫРОЖДЕ́Н//ИЕ - выраджэ́нне, - ння н; ~НЫЙ - вы́раджаны; ~ные у́ровни- вы́раджаныя ўзро́ўні.

ВЫСА́ЛИВА//НИЕ - высо́льванне, -ння , н; ~ТЕЛЬ - высо́львальнік, -кам; ~ТЬ - высо́льваць.

ВЫ́СЕРЕБР//ЕННЫЙ - вы́серабраны, пасярэ́браны; ~ИТЬ - вы́серабрыць, пасерабры́ць.

ВЫСОКОКА́ЧЕСТВЕННЫЙ - высакая́касны.

ВЫСОКОМОЛЕКУЛЯ́РН//ЫЙ: ~ые соедине́ния - высокамалекуля́рныя злучэ́нні.

ВЫСОКООРГАНИЗО́ВАННЫЙ - высокаарганізава́ны.

ВЫСОКОПОЛИМЕ́Р//НЫЙ - высокапаліме́рны; ~Ы - высокапаліме́ры, -раў мн.

ВЫ́СОЛИТЬ - вы́саліць; ~СЯ - вы́саліцца.

ВЫСУ́ШИВА//НИЕ - высу́шванне, -ння н; ~ТЬ - высу́шваць.

ВЫСЫПА́//НИЕ - высыпа́нне, - ння н; ~ННЫЙ - вы́сыпаны, павы́сыпаны;~ТЬ - высыпа́ць, павысыпа́ць.

ВЫСЫХА́//НИЕ - высыха́нне, - ння н; ~ТЬ - высыха́ць.

ВЫТЕКА́//НИЕ - выцяка́нне, -ння н; ~ТЬ - выцяка́ць.

ВЫТЕСН//Е́НИЕ - выціска́нне, - ння н; выцясне́нне, -ння н; ~ЕННЫЙ - вы́ціснуты; вы́цеснены; ~ИТЬ - вы́ціснуць; вы́цесніць; ~Я́ТЬ -выціска́ць; выцясня́ць.

ВЫ́ТЯ//ЖКА - вы́цяжка, -кі ж; ~ЖНО́Й - выцяжны́; ~НУТЬ - вы́цягнуць.

ВЫЧИСЛ//Е́НИЕ - вылічэ́нне, - ння н; ~ЕННЫЙ - вы́лічаны; ~И́ТЕЛЬ -вылiча́льнік, -ка м; ~И́ТЕЛЬНЫЙ - вылiча́льны; ~ИТЬ - вы́лічыць; ~Я́ТЬ- вылiча́ць.

ВЫЩЕЛА́ЧИВА//НИЕ - вышчало́чванне, -ння н; ~ТЬ - вышчало́чваць.

ВЫЯСН//Е́НИЕ - высвятле́нне, - ння н, выясне́нне, -ння н; ~ЕННЫЙ -вы́светлены, вы́яснены; ~ИТЬ - вы́светліць, вы́ясніць.

ВЯ́ЖУЩИЙ - вя́жучы; ~ие вещества́ - вя́жучыя рэ́чывы.

ВЯ́ЗК//ИЙ - вя́зкі; ~ОВА́ТЫЙ - вязкава́ты; ~ОСТЬ - вя́зкасць.

ВЯЗКОТЕКУ́//ЧИЙ - вязкацяку́чы; ~чее состоя́ние - вязкацяку́чы стан.

Г

ГАДОЛИ́НИЙ - гадалі́ній, -нію м.

ГАЗ - газ, га́зу м; грему́чий г.- грыму́чы газ; ко́ксовый г. - ко́ксавы газ; приро́дный г. - пры́родны газ; уду́шливый г. - уду́шлівы газ.

ГАЗИФИКАЦИЯ - газіфікацыя, -цыі ж.

ГАЗОВЫДЕЛЕНИЕ - газавыдзяленне, -ння н.

ГАЗОВЫЙ - газавы; г. раствор - газавы раствор.

ГАЗОЛИН - газалін, -ну м.

ГАЗОМЕТР - газаметр, -ра м.

ГАЗООБРАЗ//НЫЙ - газападобны; ~ное состояние - газападобны стан.

ГАЛАКТОЗА - галактоза, -зы ж.

ГАЛИЙ - галій, -лію м.

ГАЛЛО//ВЫЙ - галавы; ~вая кислота - галавая кіслата.

ГАЛОГЕН - галаген, -ну м; ~ИД - галагенід, -ду м; ~ИРОВАНИЕ - галагеніраванне, -ння н; ~НЫЙ - галагенны.

ГАЛОГЕНОВОДОРОДЫ - галагенавадароды, -даў мн.

ГАЛОГЕНОПРОИЗВОДНЫЙ - галагенавытворны; г. углеводород -галагенавытворны вуглевадарод.

ГАЛОИД - галоід, -ду м; ~НЫЙ - галоідны.

ГАЛУРГИЯ - галургія, -гіі ж.

ГАЛЬВАНИЗ//АЦИЯ - гальванізацыя, -цыі ж; ~ИРОВАНИЕ - гальванізаванне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - гальванізаваць.

ГАЛЬВАН//ИКА - гальваніка, -кі ж; ~ИЧЕСКИЙ - гальванічны;~ический элемент - гальванічны элемент.

ГАЛЬВАНОМЕТР - гальванометр, -ра м.

ГАЛЬВАНОПЛАСТИКА - гальванапластыка, -кі ж.

ГАЛЬВАНОСТЕГИЯ - гальванастэгія, -гіі ж.

ГАЛЬВАНОТЕХНИКА - гальванатэхніка, -кі ж.

ГАММА-ИЗЛУЧЕНИЕ - гамавыпрамяненне, -ння н.

ГАММА-ЛУЧИ - гама-прамяні, гама-прамянёў мн.

ГАНТЕЛЕОБРАЗ//НЫЙ : ~ная орбиталь - гантэлепадобная арбіталь; ~ная форма - гантэлепадобная форма.

ГАСИТЬ - гасіць; г. известь - гасіць вапну.

ГАФНИЙ - гафній, -нію м.

ГАШЕНИЕ - гашэнне; -ння н; г. извести - гашэнне вапны.

ГЕКСАН - гексан, -ну м.

ГЕКСАХЛОРБЕНЗОЛ - гексахлорбензол, -лу м.

ГЕКСОГЕН - гексаген, -ну м.

ГЕЛ//ИЕВЫЙ - геліевы; ~ИЙ - гелій, -лію м; ~Ь - гель, гелю м.

ГЕЛИОТРОПИН - геліятрапін, -ну м.

ГЕЛИОХИМИЯ - геліяхімія, -міі ж.

ГЕМОГЛОБИН - гемаглабін, -ну м.

ГЕН - ген, гена м; ~НЫЙ - генны; ~ный код - генны код; ~ная инженерия - генная інжынерыя.

ГЕОМЕТРИЧЕСК//ИЙ: ~ая изометрия - геаметрычная ізаметрыя.

ГЕОМЕТРИЯ: ~г. структур - геаметрыя структур.

ГЕОХ//ИМИК - геахімік, -ка м; ~ИМИЧЕСКИЙ - геахімічны; ~имический процесс - геахімічны працэс; ~ИМИЯ - геахімія, -міі ж.

ГЕРБИЦИДЫ - гербіцыды, -даў мн.

ГЕРМАНАТ - германат , -ту м.

ГЕРМАН//ИЕВЫЙ - германіевы; ~ИЙ - германій, -нію м; ~ИТ - германіт, -ту м.

ГЕТЕРОГЕНН//ОСТЬ - гетэрагеннасць, -ці ж; ~ЫЙ - гетэрагенны; ~ый катализ - гетэрагенны каталіз.

ГЕТЕРОЛИТИЧЕСК//ИЙ: ~ие реакции - гетэралітычныя рэакцыі.

ГЕТЕРОПОЛИСОЕДИНЕНИЯ - гетэраполізлучэнні, -няў мн.

ГЕТЕРОЦИКЛИЧЕСК//ИЙ: ~ие соединения - гетэрацыклічныя злучэнні.

ГЕТЕРОЯДЕРН//ЫЙ: ~ая молекула - гетэраядзерная малекула.

ГИББЕРЕЛЛИН - гіберэлін, -ну м.

ГИБРИД - гібрыд, -да м; ~ИЗАТОР - гібрыдызатар, -ра м; ~ИЗАЦИЯ -гібрыдызацыя, -цыі ж; ~НЫЙ - гібрыдны; ~ная орбиталь - гібрыдная арбіталь.

ГИГРОСКОПИЧ//ЕСКИЙ - гіграскапічны; ~НОСТЬ - гіграскапічнасць,-ці ж; ~НЫЙ - гіграскапічны; ~ные вещества - гіграскапічныя рэчывы.

ГИДРАЗИН - гідразін, -ну м.

ГИДРАТ - гідрат, -ту м; ~АЦИЯ - гідратацыя, -цыі ж; ~НЫЙ - гідратны;~ная оболочка - гідратная абалонка.

ГИДРИД - гідрыд, -ду м.

ГИДРИРОВА//НИЕ - гідрыраванне, -ння н; ~ННЫЙ - гідрыраваны;~ТЬ -гідрыраваць.

ГИДРОГЕНИЗ//АЦИЯ - гідрагенізацыя, -цыі ж; ~ ИРОВАННЫЙ - гідрагенізаваны.

ГИДРОЗОЛЬ - гідразоль, -лю м; ~НЫЙ - гідразольны.

ГИДРОКАРБОНАТ - гідракарбанат, -ту м.

ГИДРОКСИД - гідраксід, -ду м; ~НЫЙ - гідраксідны;~ная группа -гідраксідная група.

ГИДРОКСИЛ//ИРОВАНИЕ - гідраксілаванне, -ння н; ~ЬНЫЙ - гідраксільны; ~ьная группа - гідраксільная група.

ГИДРОКСОГРУППА - гідраксагрупа, -пы ж.

ГИДРОКСОКОМПЛЕКС - гідраксакомплекс, -са м. измерения

ГИДРОКСОНИЙ-КАТИОН - гідраксоній-катыён, -ёну м.

ГИДРОЛИ//З - гідроліз, -зу м; ~ЗНЫЙ - гідролізны; ~ ТИЧЕСКИЙ -гідралітычны;~ЗОВАТЬ - гідралізаваць; ~ЗОВАТЬСЯ - гідралізавацца.

ГИДРООКИСЕЛ - гідравокісел, -слу м.

ГИДРОТЕРМАЛЬНЫЙ: ~ый процесс - гідратэрмальны працэс.

ГИДРОФИЛЬ//НОСТЬ - гідрафільнасць, -ці ж; ~НЫЙ - гідрафільны.

ГИДРОФОБН//ОСТЬ - гідрафобнасць, -ці ж; ~ЫЙ - гідрафобны.

ГИДРОХ//ИМИЧЕСКИЙ - гідрахімічны; ~ИМИЯ - гідрахімія, -міі ж.

ГИДРОХИНОН - гідрахінон, -ну м.

ГИПЕРСОРБЦИЯ - гіперсорбцыя, -цыі ж.

ГИПОСУЛЬФИТ - гіпасульфіт, -ту м.

ГИПОФОСФИТ - гіпафасфіт, -ту м.

ГИПОХЛОРИТ - гіпахларыт, -ту м.

ГИПС - гіпс, -су м; ~ОВАННЫЙ - гіпсаваны; ~ОВАТЬ - гіпсаваць; ~ОВЫЙ - гіпсавы.

ГЛЁТ - глёт, глёту м.

ГЛИКОГЕН - глікаген, -ну м.

ГЛИКОЛ//Ь - гліколь, -лю м; ~ИЗ - гліколіз, -зу м.

ГЛИНОЗЁМ - глiназём, -му; ~ИСТЫЙ - гліназёмісты; ~НЫЙ - гліназёмны.

ГЛИЦЕРИН - гліцэрына, -ны ж; ~ОВЫЙ - гліцэрынавы.

ГЛИЦИН - гліцын, -ну м.

ГЛЮКОЗ//А - глюкоза, -зы ж; ~НЫЙ - глюкозны.

ГЛЮТАМИН - глютамін, -ну м; ~ОВЫЙ - глютамінавы.

ГНИЕНИЕ - гніенне, -ння н.

ГОЛУБЕЦ - галубец, -бцу м.

ГОЛУБОЙ - блакітны; г. цвет - блакітны колер.

ГОЛЬМИЙ - гольмій, -мію м.

ГОМОГЕНН//ОСТЬ - гамагеннасць, -ці ж; ~ЫЙ - гамагенны; ~ый катализ - гамагенны каталіз; ~ая система - гамагенная сістэма.

ГОМОЛИТИЧЕСК//ИЙ : ~ая реакция - гамалітычная рэакцыя.

ГОМОЛОГ - гамолаг, -га м; ~ИЧЕСКИЙ, ~ИЧНЫЙ - гамалагічны; ~ический ряд - гамалагічны рад.

ГОРЕЛКА - гарэлка, -кі ж.

ГОРЕ//НИЕ - гарэнне, -ння н; ~ТЬ - гарэць; ~ЧЬ - гарката, -ты ж, гаркота, -ты ж; горыч, -чы ж.

ГОРЛЫШКО - рыльца, -ца н.

ГОРМОН - гармон, -ну ж; ~АЛЬНЫЙ - гарманальны.

ГОРЮЧ//ИЙ - гаручы; г. газ - гаручы газ; ~ие сланцы - гаручыя сланцы.

ГОРЯЧ//ИЙ: ~ие атомы - гарачыя атамы.

ГОТОВИТЬ - гатаваць, рыхтаваць; ~СЯ - гатавацца, рыхтавацца.

ГРАВИМЕТР - гравіметр, -ра м; ~ИЧЕСКИЙ - гравіметрычны; ~ИЯ -гравіметрыя, -рыі ж.

ГРАДУИРОВ//АНИЕ - градуіраванне, -ння н; ~АННЫЙ - градуіраваны; ~АТЬ - градуіраваць; ~КА - градуіроўка, -кі ж.

ГРАДУС - градус, -са м; ~НИК - градуснік, -ка м; ~НЫЙ - градусны.

ГРАММ - грам, грама м.

ГРАММ-АТОМ - грам-атам, -ма м.

ГРАММ-МОЛЕКУЛА - граммалекула, -лы ж.

ГРАММОМЕТР - грамаметр, -ра м.

ГРАНИ//ЦА - граніца, -цы ж, мяжа, -жы ж; ~ЧИТЬ - гранічыць, межавацца, межаваць; ~ЧНЫЙ - гранічны.

ГРАНУЛ//А - гранула, -лы ж; ~ИРОВАНИЕ - грануляванне, -ннян; ~ИРОВАННЫЙ - грануляваны; ~ИРОВАТЬ - грануляваць.

ГРАФИ//К - графік, -ка м; ~ЧЕСКИЙ - графічны; ~ческие формулы -графічныя формулы.

ГРАФИТ - графіт, -ту м; ~НЫЙ - графітны; ~ОВЫЙ - графітавы; ~ОВАЯ смазка - графітавая змазка.

ГРЕМ//ЕТЬ - грымець; ~УЧИЙ - грымучы; ~учая ртуть - грымучая ртуць; ~учий газ - грымучы газ.

ГРОЗОВОЙ : г. разряд - навальнічны разрад.

ГРУНТ - грунт, грунту м; ~ОВКА - грунтоўка, -кі ж; ~ОВОЙ- грунтавы; ~овые краски - грунтавыя фарбы; ~ОВОЧНЫЙ - грунтовачны.

ГРУПП//А - група, -пы ж; главная г. - галоўная група; побочная г.- пабочная група; ~ИРОВАТЬ - групаваць; ~ИРОВКА - групаванне,-ння н, групоўка, -кі ж.

ГУБЧАТ//ЫЙ - губчаты, губкаваты; ~ое железо - губчатае жалеза;~ая резина - губчатая /губкаватая/ гума /рызіна/.

ГУДРОН - гудрон, -ну м; ~НЫЙ - гудронны.

ГУММІ - гумі, нескл. н.

ГУСТОТЁРТЫЙ - густацёрты.

Д

ДАВЛЕНИЕ - ціск, ціску м; атмосферное д. - атмасферны ціск; под давлением - пры ціску.

ДАЛЬНИЙ: д. порядок - далёкі парадак.

ДВИЖ//ЕНИЕ - рух, руху м; ~УЩИЙ -рухаючы.

ДВОЕНИЕ - дваенне, -ння н.

ДВОЙ//НОЙ - двайны, падвойны; ~ной электрический слой - двайны электрычны слой; ~ная связь - двайная сувязь; ~ные соли - двайныя /падвойныя/ солі; ~ СТВЕННОСТЬ - дваістасць, -ці ж; ~СТВЕННЫЙ - дваісты; ~ственная природа электрона - дваістая прырода электрона.

ДВУОКИСЬ - двухвокіс, -су м.

ДВУСТОРОНН//ИЙ - двухбаковы; ~яя связь - двухбаковая сувязь.

ДВУУГЛЕКИСЛЫЙ - двухвуглякіслы.

ДВУХАТОМНЫЙ - двухатамны; д. кислород - двухатамны кісларод.

ДВУХВАЛЕНТНЫЙ - двухвалентны.

ДВУХЛОРИСТЫЙ - двуххлорысты.

ДЕГАЗА//ТОР - дэгазатар, -ра м; ~ЦИОННЫЙ - дэгазацыйны; ~ЦИЯ -дэгазацыя, -цыі ж.

ДЕГАЛОГЕНИРОВАНИЕ - дэгалагенаванне, -ння н.

ДЕГИДР//АТАЦИЯ - дэгідратацыя, -цыі ж; ~АТИРОВАТЬ - дэгідратаваць; ~ИРОВАТЬ - дэгідраваць; ~ИРОВАНИЕ - дэгідраванне,-ння н.

ДЕГИДРОГЕНИЗАЦИЯ - дэгідрагенізацыя, -цыі ж.

ДЁГОТЬ - дзёгаць, -гцю м; д. древесный - дзёгаць драўнінны.

ДЕЙСТВ//ИЕ - дзеянне, -ння н; уздзеянне, н, уплыў, -лыву м;~ОВАТЬ - дзейнічаць; уздзейнічаць, уплываць; кислота действует на металл - кіслата уздзейнічае на метал; ~УЮЩИЙ -

дзеючы;~ующих масс закон - дзеючых мас закон.

ДЕЙТЕРИЙ - дэйтэрый, -рыю м.

ДЕКАЛИН - дэкалін, -ну м.

ДЕКАЛЬЦИНАЦИЯ - дэкальцынацыя, -цыі ж.

ДЕКАН - дэкан, -ну м; ~ТАЦИЯ - дэкантацыя, -цыі ж; ~ТИРОВАТЬ -дэкантаваць.

ДЕХЛОР//АЦИЯ - дэхларацыя, -цыі ж; ~ИРОВАНИЕ - дэхлараванне, -ннян; ~ИРОВАТЬ - дэхлараваць.

ДИАГНОЗ - дыягназ, -зу м.

ДИАГНОСТИЧЕСК//ИЙ: ~ие средства - дыягнастычныя сродкі.

ДИАГРАММА - дыяграма, -мы ж; д.плавкости - дыяграма плаўкасці; д. растворимости - дыяграма растваральнасці; д. состояния - дыяграма стану.

ДИАЗОСОЕДИНЕНИЕ - дыязазлучэнне, -ння н.

ДИАЗОСОСТАВЛЯЮЩАЯ - дыязаскладаючая.

ДИАЗОТИРОВА//НИЕ - дыязатаванне, -ння н; ~ТЬ- дыязатаваць.

ДИАЛИЗ - дыяліз, -зу м; ~АТОР - дыялізатар, -ра м.

ДИАМАГН//ЕТИЗМ - дыямагнетызм, -му м; ~ИТНЫЙ - дыямагнітны.

ДИАМЕТР - дыяметр, -ра м; ~АЛЬНО - дыяметральна; ~АЛЬНЫЙ -дыяметральны.

ДИАМИН - дыямін, -ну м.

ДИАПАЗОН - дыяпазон, -ну м.

ДИБОРАН - дыбаран, -ну м.

ДИВИНИЛ - дывініл, -лу м; ~ОВЫЙ - дывінілавы, ~ЬНЫЙ - дывінілавы;~ьные каучуки - дывінілавыя каўчукі.

ДИЗЕЛЬН//ЫЙ: ~ое топливо - дызельнае паліва.

ДИМЕРИЗАЦИЯ - дымерызацыя, -цыі ж.

ДИНАМИКА - дынаміка, -кі ж.

ДИНАМИТ - дынаміт, -ту м.

ДИНАМИЧ//ЕСКИЙ , ~НЫЙ - дынамічны; ~еский режим - дынамічны рэжым; ~еская стереохимия - дынамічная стэрэахімія.

ДИПОЛЬ - дыполь, -ля м; ~НЫЙ - дыпольны; ~ный момент - дыпольны момант.

ДИСАХАРИДЫ - дысахарыды, -даў мн. , дыцукрыды, -даў мн.

ДИСКУССИОННЫЙ - дыскусійны.

ДИСПЕРГ//АТОР - дыспергатар, -ра м; раздрабляльнік, -ка м; ~ИРОВАНИЕ - дыспергаванне, -ння н, раздрабленне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - дыспергаваць, раздрабляць.

ДИСПЕРС//ИОННЫЙ - дысперсійны; ~ИЯ - дысперсія, -сіі ж; ~НОСТЬ -дысперснасць, -ці ж; ~НЫЙ - дысперсны; ~ые системы - дысперсныя сістэмы.

ДИСПРОП//ОРЦИОНАЛЬНОСТЬ - дыспрапарцыянальнасць, -ці ж; ~ОРЦИОНАЛЬНЫЙ - дыспрапарцыянальны; ~ ОРЦИОНИРОВАНИЕ - дыспрапарцыянаванне, -ння н; ~ ОРЦИОНИРОВАТЬ - дыспрапарцыянаваць; ~ОРЦИЯ - дыспрапорцыя, -цыі ж.

ДИССОЦИ//АЦИЯ - дысацыяцыя, -цыі ж; распад, -ду м;

~ИРОВАТЬ -дысацыяваць; распадацца.

ДИСТИЛЛ//ИРОВАНИЕ - дыстыляванне, -ння н; ~ИРОВАННЫЙ -дыстыляваны; ~ированная вода - дыстыляваная вада; ~ИРОВАТЬ -дыстыляваць; ~ЯТ - дыстылят, -ту м; ~ЯТОР - дыстылятар, -ра м;~ЯЦИЯ - дыстыляцыя, -цыі ж.

ДИФОСГЕН - дыфасген, -ну м.

ДИФРАКЦ//ИОННЫЙ - дыфракцыйны; ~ионный метод - дыфракцыйны метад;~ионная решётка - дыфракцыйная рашотка; ~ИЯ - дыфракцыя, -цыі ж.

ДИФФУЗ//ИОННЫЙ - дыфузійны; ~ИЯ - дыфузія, -зіі ж; ~НЫЙ -дыфузны; ~ный потенциал - дыфузны патэнцыял; ~ОР - дыфузар, -ра м.

ДИХРОМ - дыхром, -му м; ~АТ - дыхрамат, -ту м; ~ОВЫЙ - дыхромавы;~овая кислота - дыхромавая кіслата.

ДИЭЛЕКТР//ИК - дыэлектрык, -ка м; ~ИЧЕСКИЙ - дыэлектрычны.

ДЛИНА - даўжыня, -ні ж; д. волны - даўжыня хвалі; д. связи - даўжыня сувязі.

ДЛИТЕЛЬН//О - працягла; ~ОСТЬ - працягласць, -ці ж; ~ЫЙ -працяглы; доўгі.

ДНИЩЕ - днішча, -ча н.

ДНО - дно, дна н.

ДОАТОМНЫЙ - даатамны.

ДОБАВ//ИТЬ - дабавіць; прыбавіць; ~КА, ~ЛЕНИЕ - дабаўленне, -ння н; прыбаўленне, -ння н; ~ЛЕННЫЙ - прыбаўлены; ~ЛЯТЬ - дабаўляць; прыбаўляць; ~ОЧНЫЙ - прыбавачны, дадатковы.

ДОБЫВА//НИЕ - здабыванне, -ння н; ~ТЬ - здабываць; ~ЮЩИЙ -здабываючы.

ДОБЫ//ТЫЙ - здабыты; ~ТЬ - здабыць; ~ЧА - здабыча, -чы ж.

ДОВЕДЕН//ИЕ - давядзенне, -ння н; ~НЫЙ - даведзены.

ДОВЕРХУ - даверху.

ДОВЕСТИ - давесці; д. до кипения - давесці да кіпення.

ДОВОД - доказ, -зу м, довад, -ду м; приводить ~ы - прыводзіць довады.

ДОВОЛЬНО - хопіць, досыць, даволі.

ДОГАДКА - здагадка, -кі ж, дагадка, -кі ж.

ДОЗАТОР - дазатар, -ра м.

ДОКАЗА//ТЕЛЬНЫЙ - доказны; пераканаўчы, слушны; ~ ТЕЛЬСТВО - доказ, -зу м; довад, -ду м; ~ТЬ - даказаць, давесці.

ДОЛИВА//НИЕ - даліванне, -ння н; ~ТЬ - даліваць.

ДОЛОМИТ - даламіт, -ту м; ~НЫЙ, ~ОВЫЙ - даламітавы.

ДОЛЯ - доля, -лі ж; частка, -кі ж; д. массовая - доля масавая; д. молярная - доля малярная; д. участия электрона в образовании связи - доля ўдзелу электрона пры ўтварэнні сувязі.

ДОМЕНН//ЫЙ - доменны; ~ая печь - доменная печ, домна, -ны ж; ~ый процесс - доменны працэс.

ДОМЕША//ННЫЙ - дамяшаны; ~ТЬ -дамяшаць.

ДОМНА - домна, -ны ж.

ДОНОР - донар, -ра м;~НЫЙ - донарны; ~СКИЙ - донарскі.

ДОНОРНО-АКЦЕПТОРН//ЫЙ: ~ое взаимодействие - донарна-акцэптарнае ўзаемадзеянне.

ДОПУС//К - допуск, -ку м; ~КАЕМЫЙ - дапушчальны; ~ ТИМО - дапушчальна; ~ ТИМОСТЬ - дапушчальнасць, -ці ж; ~ТИМЫЙ -дапушчальны.

ДОПУЩЕН//ИЕ - дапушчэнне, -ння н; ~НЫЙ - дапушчаны.

ДОСРОЧНЫЙ - датэрміновы.

ДОСТИЖЕНИЕ - дасягненне, -ння н.

ДОСУХА - насуха, дасуха, досуха.

ДОТОШНО - унікліва; дакладна; акуратна; пунктуальна; скурпулёзна.

ДРЕВЕС//ИНА - драўніна, -ны ж.

ДРЕВЕСНОВОЛОКНИСТ//ЫЙ: ~ая плита - драўнянавалакністая пліта.

ДРЕВЕСН//ЫЙ - драўняны; дрэўны; д. спирт - драўняны спірт; ~ая смола - дрэўная смала.

ДРОБ//ИТЬ - драбіць, драбніць; крышыць; ~ЛЕНИЕ -драбленне, -ння н, драбненне, -ння н; крышэнне, -ння н; ~ЛЁННЫЙ - драблёны,драбнёны; крышаны.

ДРОБНЫЙ - 1. дробавы; 2. дробны.

ДРОБЬ - шрот, шроту м.

ДРОБЬ - дроб, дробу м.

ДУБ//ИЛЬНЫЙ - дубільны; ~ИТЬ - дубіць; ~ЛЕНИЕ - дубленне, -ння н;~ЛЕННЫЙ, ~ЛЁНЫЙ - дублены.

ДУРНО - дрэнна, пагана, кепска, блага; д. пахнет - дрэнна пахне.

ДУСТ - дуст, дусту м.

ДУТЫЙ - выдзіманы, дзьмуты.

ДУ//ТЬ - дзьмуць, дзьмухаць; ~ТЬЁ - выдзіманне, -ння н.

ДУХОВКА - духоўка, -кі ж.

ДУШИСТ//ЫЙ - пахучы, духмяны; ~ые вещества - пахучыя рэчывы.

ДЫМ - дым, дыму м; ~ИТЬ - дымець; дыміць; ~НЫЙ - дымны; ~ОВОЙ -дымавы; ~овые составы - дымавыя саставы.

ДЮРАЛЬ - дзюраль, -лю м.

ДЮРАЛЮМИН//ИЕВЫЙ - дзюралюмініевы; ~ИЙ дзюралюміній, -нію м.

Е

ЕВРОПИЙ - еўропій, -пію м.

ЕДИНИ//ЦА - адзінка, -кі ж; ~ЧНЫЙ - адзінкавы.

ЕДКИЙ - едкі; е. дым - едкі дым.

ЁМКОСТЬ - ёмістасць, -ці ж; ё. уровня - ёмістасць узроўню; ё. подуровня - ёмістасць падузроўню.

ЕСТЕСТВЕННОНАУЧНЫЙ - прыродазнаўчы.

ЕСТЕСТВЕННЫЙ - натуральны.

ЕСТЕСТВОЗНАНИЕ - прыродазнаўства, -ва н.

Ж

ЖАВЕ//ЛЕВ - ~левая вода - жавелевая вада; ~ЛЬ - жавель, -вялю м, хлёрка, -кі ж.

ЖАРОПРОЧН//ОСТЬ - гарачатрываласць, -ці ж; ~ЫЙ - гарачатрывалы.

ЖАРОСТОЙК//ИЙ - гарачаўстойлівы; ~ОСТЬ - гарачаўстойлівасць, -ці ж.

ЖЕЛАТИ//Н - жэлацін, -ну м; ~НА - жэлаціна, -ны ж; ~НИРОВАНИЕ - жэлацінаванне, -ння н; ~НОВЫЙ - жэлацінавы.

ЖЕЛЕ - жэле, нескл. н.

ЖЕЛЕЗИСТЫЙ - жалезісты.

ЖЕЛЕЗНЫЙ - жалезны; ж, колчедан - жалезны калчадан; ж. катализатор - жалезны каталізатар; ж. купорос - жалезны купарвас; ж. сплав - жалезны сплаў; ж. сурик - жалезны сурык.

ЖЕЛЕЗО - жалеза, -за н.

ЖЕЛЕЗНЯК - жалязняк, -ку м; магнитный ж. - магнітны жалязняк.

ЖЕЛЕЗОРУДНЫЙ - жалезарудны.

ЖЕЛЕЗОСОДЕРЖАЩИЙ - жалезазмяшчальны.

ЖЕЛЕЗОУГЛЕРОДИСТ//ЫЙ - жалезавугляродзісты; ~ые стали - жалезавугляродзістыя сталі.

ЖЕЛТЬ - жаўцянка, -кі ж.

ЖЕЛЧН//ЫЙ: ~ые кислоты - жоўцевые кіслоты.

ЖЕСТК//ИЙ - жорсткі; ~ие условия - жорсткія ўмовы; ~ая вода - жорсткая вада; ~ая связь - жорсткая сувязь; ~ие молекулы - жорсткія малекулы.

ЖЁСТКОСТЬ - жорсткасць, -ці ж; ж. воды - жорсткасць вады.

ЖИВИЦА - жывіца, -цы ж.

ЖИДК//ИЙ - вадкі, рэдкі; ж. газ - вадкі газ; ж. кристалл -вадкі крышталь; ~ая смесь - рэдкая сумесь; ~ое стекло - вадкае шкло.

ЖИДКОС//ТНЫЙ - вадкасны; ~тная хроматография - вадкасная храматаграфія; ~ТЬ - вадкасць, -ці ж.

ЖИДКОКРИСТАЛЛИЧЕСКИЙ - вадкакрышталічны.

ЖИДКОМЕТАЛЛИЧЕСКИЙ - вадкаметалічны.

ЖИР - тлушч, тлушчу м; ж. животный - жывёльны тлушч; ж. растительный - раслінны тлушч; ~НЫЙ - тлусты; ~ные кислоты - тлушчавыя кіслоты.

ЖИРОРАСТВОРИМ//ЫЙ: ~ые красители - тлушчарастваральныя фарбавальнікі.

З

ЗАБЛУЖД//АТЬСЯ - памыляцца; ~ЕНИЕ -памылка, -кі ж.

ЗАБРЫЗГА//ННЫЙ - запырсканы; ~ТЬ - запырскаць; ~ТЬСЯ - запырскацца.

ЗАВЕРШ//АТЬ - завяршаць; ~АЮЩИЙ - завяршаючы, завяршальны; ~ЕНИЕ- завяршэнне, -ння н; ~ЁННОСТЬ - завершанасць, -ці ж; ~ЁННЫЙ - завершаны; ~ённый уровень - завершаны ўзровень; ~ИТЬ - завяршыць.

ЗАВИСАТЬ - завісаць.

ЗАВИС//ЕТЬ - залежаць; ~ИМОСТЬ - залежнасць, -ці ж; ~ИМЫЙ-залежны.

ЗАВИХРЕНИЕ - завіхрэнне, -ння н.

ЗАГАЗОВАНН//ОСТЬ - загазаванасць, -ці ж;~ЫЙ - загазаваны.

ЗАГОРА//НИЕ - загарванне, -ння н; загаранне, -ння н; ~ТЬСЯ -

загарацца, загарвацца, запальвацца.

ЗАГРЯЗН//ЕНИЕ - забруджванне, -ння н, забрудненне, -ння н; ~ЁННЫЙ - забруджаны; запэцканы; ~ИТЬ - забрудзіць; запэцкаць; ~ЯТЬ -забруджваць; пэцкаць.

ЗАГУС//ТЕВАТЬ - загусаць, гусцець; ~ЕЛЫЙ - загусцелы, загуслы;~ТЕТЬ - загусцець, загуснуць; ~ТИТЬСЯ - загусціцца.

ЗАДАН//ИЕ - заданне, -ння н; ~НЫЙ - зададзены.

ЗАДЕРЖА//НИЕ - затрыманне, -ння н; ~ТЬ - затрымаць.

ЗАДУТЬ - затушыць, загасіць, задзьмуць.

ЗАДЫМ//ИТЬ - задымець; ~ИТЬСЯ - задыміцца;~ЛЕННЫЙ - задымлены,закураны.

ЗАЖЕЧЬ - запаліць; ~СЯ - запаліцца, загарэцца.

ЗАЖЖЁННЫЙ - запалены.

ЗАЖИГА//НИЕ - запальванне, -ння н; ~ТЕЛЬНЫЙ - запальны; ~тельные сплавы - запальныя сплавы ; ~ТЬ -запальваць; ~ТЬСЯ - запальвацца, загарацца.

ЗАЖИМ - заціск, -ку м,~АНИЕ - зацісканне, -ння н; ~АТЬ - заціскаць, сціскаць; зашчэмліваць.

ЗАИЗВЕСТКОВА//ННЫЙ - завапнаваны; ~ТЬ - завапнаваць.

ЗАКИП//АНИЕ - закіпанне, -ння, н; ~АТЬ - закіпаць; ~ЕТЬ - закіпець.

ЗАКИСЛЁННЫЙ - закіслены.

ЗАКИСЬ - закіс, -су м.

ЗАКОН - закон, -ну м; з. Авогадро - закон Авагадра; ~НО - законна; ~НЫЙ - законны, абавязковы.

ЗАКОНОМЕРН//ОСТЬ - заканамернасць, -ці ж; ~ЫЙ - заканамерны.

ЗАКОП//ТЕВШИЙ - ~ТЕЛЫЙ - закураны, закуродымлены; ~ТИТЬСЯ - закурацъ.

ЗАКРАШ//ЕННЫЙ - зафарбаваны; ~ИВАТЬСЯ - зафарбоўвацца.

ЗАКРЕПИ//ТЕЛЬ - замацавальнік, -ка м; фіксаж, -жу м;~ТЬ - замацаваць.

ЗАКРИСТАЛЛИЗОВА//ННЫЙ - закрышталізаваны; ~ТЬ - закрышталізаваць; ~ТЬСЯ -закрышталізавацца.

ЗАКУПОР//ЕННЫЙ - заткнуты; закаркаваны; ~ИВАНИЕ - затыканне, -ння н; закаркоўванне, -ння н; ~ИВАТЬ - затыкаць; закаркоўваць;~ИТЬ - заткнуць; закаркаваць.

ЗАКУР//ЕННЫЙ - закураны; ~ИТЬСЯ - закурыцца.

ЗАЛЕГА//НИЕ - заляганне, -ння н; залеж, -жы ж; ~ТЬ - залягаць.

ЗАЛЕЖИ - залежы, -жаў мн.

ЗАМЕДЛ//ЕНИЕ - запавольванне, -ння н, замаруджванне, -ння н; ~ЕННЫЙ - запаволены, замаруджаны; ~ИТЬ - запаволіць, замарудзіць; прыцішыць; ~ИТЬСЯ - запаволіцца, замарудзіцца; прыцішыцца; ~ЯТЬ - запавольваць, замаруджваць; прыцішаць; ~ЯТЬСЯ - замаруджвацца, запавольвацца; прыцішацца, прыцішвацца.

ЗАМЕРЗА//НИЕ - замярзанне, -ння н; точка ~ния - пункт замярзання;~ТЬ - замярзаць.

ЗАМЕСТИТЕЛЬ - замяшчальнік, -ка м.

ЗАМЕЩАТЬ - замяшчаць.

ЗАМЕТИТЬ - заўважыць, прымеціць; убачыць.

ЗАМЕЧАН//ИЕ - заўвага, -гі ж; ~ТЬ - заўважаць, прымячаць; бачыць.

ЗАМЕШ//АТЬ - пачаць мяшаць; ~ИВАНИЕ - замешванне, -ння н; ~ИВАТЬ -замешваць.

ЗАМЕЩ//АТЬ - замяшчаць; ~АТЬСЯ -замяшчацца; ~ЕНИЕ - замяшчэнне, -ння н; реакция ~ения - рэакцыя замяшчэння; ~ЕННЫЙ - замешчаны.

ЗАМКНУТЫЙ - замкнуты, замкнёны.

ЗАНИМАТЕЛЬН//О - займальна, цікава; ~ОСТЬ - займальнасць, -ці ж, цікавасць, -ці ж; ~ЫЙ - займальны, цікавы.

ЗАПАХ - пах, паху м; обладающий ~ом - пахучы, які мае пах.

ЗАПАЯ//ННЫЙ - запаяны; ~ТЬ - запаяць.

ЗАПЛЕСНЕВЕЛЫЙ - цвілы, запляснелы, запляснелы; забраснелы.

ЗАПОЛН//ЕНИЕ - запаўненне, -ння н; з. орбиталей - запаўненне арбіталяў; ~ЕННЫЙ - запоўнены; ~ИТЕЛЬ - запаўняльнік, -ка м; запаўніцель, -ля м; ~ИТЬ - запоўніць; ~ИТЬСЯ - запоўніцца; ~ЯТЬ -запаўняць; ~ЯТЬСЯ - запаўняцца.

ЗАПОТЕ//ВШИЙ - запацелы; ~ЛЫЙ - запацелы; ~ТЬ -запацець.

ЗАПРЕТ - забарона, -ны ж; ~ИТЕЛЬНЫЙ - забаронны; ~ИТЬ -забараніць; ~НЫЙ - забаронены, забаронны.

ЗАПРЕЩ//АТЬ - забараняць; ~ЕНИЕ - забарона, -ны ж; ~ЁННЫЙ -забаронены; ~ЕНО - забаронена.

ЗАРЖАВ//ЕВШИЙ - заржавелы; ~ЕТЬ - заржавець; ~ЛЕННЫЙ - іржавы;заржавелы; заржаўлены.

ЗАРЯД - зарад, -ду м; положительный з. - дадатны зарад; отрицательный з. - адмоўны зарад.

ЗАРЯЖ//АТЬ - зараджаць; ~АТЬСЯ - зараджацца; ~ЕННЫЙ - зараджаны.

ЗАСЕЛ//ЕНИЕ - засяленне, -ння н; з. орбиталей - засяленне арбіталяў; ~ИТЬ - засяліць; ~ ИТЬСЯ - засяліцца; ~ЯТЬ - засяляць.

ЗАТРА//ТА - затрата , -ты ж; выдатак, -тку м; ~ТИТЬ - затраціць;выдаткаваць; ~ЧЕННЫЙ - затрачаны; выдаткаваны; ~ ЧИВАТЬ -затрачваць; выдаткоўваць.

ЗАТРУДН//ЕНИЕ - цяжкасць, -ці ж; замінка, -кі ж; затрымка, -кі ж;~ЁННЫЙ - цяжкі; ~ ИТЕЛЬНЫЙ - цяжкаваты.

ЗАТУХА//НИЕ - затуханне, -ння н; загасанне, -ння н;~ТЬ - затухаць, гаснуць, загасаць; ~ЮЩИЙ - загаслы.

ЗАТХЛ//ОСТЬ -затхласць, -ці ж; ~ЫЙ - затхлы.

ЗАФИКСИРОВА//ННЫЙ - зафіксаваны; ~ТЬ - зафіксаваць.

ЗАЩИТ//А - абарона; -ны ж; засцярога, -гі ж; ахова, -вы ж;~ИТЕЛЬНЫЙ - абарончы; засцерагальны; ахоўны; ~НЫЙ - абаронны;засцерагальны; ахоўны; ~ный слой - засцерагальны слой; ~ные покрытия - засцерагальныя пакрыцці.

ЗВЕНО - звяно, -на н; з. структурное - звяно структурнае.

ЗВУК - гук, гуку м; ~ОВОЙ - гукавы.

ЗЕРКАЛ//О - люстра, -ра н; люстэрка, -ка н;~ЬНЫЙ - люстраны;~ьное стекло - люстраное шкло.

ЗЕРНИСТ//ОСТЬ - зярністасць, -ці ж; ~ЫЙ - зярністы.

ЗНАМЕНАТЕЛ//Ь: з. дроби - назоўнік дробу; привести к одному ~ю -прывесці да аднаго назоўніка; прывесці да адной роўніцы.

ЗНАЧ//ЕНИЕ - значэнне, -ння н; ~ИМОСТЬ - значнасць, -ці ж;важнасць, -ці ж; значэнне, -ння н; ~ИМЫЙ - значны, важны; ~ИТЬ -значыць, азначаць, мець значэнне.

ЗОЛ//А - попел, -лу м; ~ИСТОСТЬ - залістасць, -ці ж; ~ИСТЫЙ -залісты.

ЗОЛОТ//О - золата, -та н; ~ОЙ - залаты.

ЗОЛОЧ//ЕНИЕ - залачэнне, -ння н; пазалочванне, -ння н; ~ЁННЫЙ -залочаны; ~ЁНЫЙ - пазалочаны.

ЗОЛЬ - золь, золю м.

ЗОЛЬН//ОСТЬ - зольнасць, -ці ж; ~ЫЙ -попельны; зольны.

ЗООХИМИЧЕСКИЙ - зоахімічны.

ЗООХИМИЯ - заахімія, -міі ж.

ЗРИМ//О - бачна; ~ОСТЬ - бачнасць, -ці ж;~ЫЙ - бачны.

И

ИДЕАЛЬН//О - ідэальна;~ОСТЬ - ідэальнасць, -ці ж; ~ЫЙ - ідэальны;~ый газ - ідэальны газ.

ИЗБЕГАТЬ - пазбягаць; унікаць; ухіляцца; абходзіць, абыходзіць,абмінаць, мінаць.

ИЗБИРАТЕЛЬН//ОСТЬ - выбіральнасць, -ці ж;~ЫЙ - выбіральны,~ая адсорбция - выбіральная адсорбцыя.

ИЗБЫТ//ОК - лішак, -шку м; празмернасць, -ці ж; с избытком - з лішкам; ~ОЧНЫЙ - залішні, лішні; ~очное количество - залішняя колькасць.

ИЗВЕСТКОВ//ЫЙ - вапнавы; ~ая вода - вапнавая вада; ~ое молоко - вапнавае малако; ~ые удобрения-вапнавыя ўгнаенні.

ИЗВЕСТНЯК - вапняк, -ку м;~ОВЫЙ - вапняковы.

ИЗВЕСТЬ - вапна, -ны ж.

ИЗВЕЩАТЬ - паведамляць; апавяшчаць, наказваць.

ИЗВЛЕ//КАТЬ - здабываць; ~ЧЕНИЕ - здабыванне, -ння н; атрыманне,-ння н; ~ЧЁННЫЙ - здабыты; атрыманы.

ИЗВНЕ - звонку, знадворку.

ИЗГИБ - выгін, -ну м, выгіб, -бу м; ~АЕМОСТЬ - гнуткасць, -ці ж;~АНИЕ - выгінанне, -ння н, выгібанне, -ння н; ~АТЬ -выгінаць, выгібаць; ~ИСТЫЙ - гнуткі.

ИЗГОТОВ//ИТЬ -вырабіць; зрабіць; ~ЛЕНИЕ - выраб, -бу м; ~ЛЕННЫЙ -выраблены; зроблены.

ИЗЛАГАТЬ - выкладаць; выказваць; расказваць; тлумачыць.

ИЗЛИШЕ//К - лішак, -шку м; празмернасць, -ці ж; ~СТВО - празмернасць, -ці ж.

ИЗЛИЯНИЕ - выліванне, -ння н; выцяканне, -ння н.

ИЗЛУЧ//АТЕЛЬ - выпраменьвальнік, -ка м; ~АТЕЛЬНЫЙ - выпраменьвальны; ~ательная способность - выпраменьвальная здольнасць; ~АТЬ - выпраменьваць; вылучаць; ~АТЬСЯ - выпраменьвацца; вылучацца; ~ЕНИЕ - выпраменьванне, -ння н; тепловое ~ение - цеплавое выпраменьванне; световое ~ение - светавое выпраменьванне.

ИЗМЕЛЬЧ//АТЬ - драбніць; крышыць; таўчы; ~ЕНИЕ - драбненне, -ння н; крышэнне, -ння н; таўчэнне, -ння н; ~ение пробы - драбненне пробы; ~ЁННЫЙ - здробнены; скрышаны, пакрышаны, патоўчаны; ~ИТЕЛЬ- здрабняльнік, -ка м.

ИЗМЕН//ЕНИЕ - змена, -ны ж; змяненне, -ння н; перамена, -ны ж;~ЁННЫЙ - зменены; перамененый; ~ИТЬ - змяніць; відазмяніць, перайначыць; перамяніць; ~ ЧИВЫЙ - зменлівы; ~ЯЕМОСТЬ - зменнасць,-ці ж; зменлівасць, -ці ж; ~ЯТЬ - мяняць, зменьваць; відазмяняць, перайначваць; пераменьваць.

ИЗМЕР//ЕНИЕ - вымярэнне, -ння н; ~ЕННЫЙ - змераны, вымераны;~ИМОСТЬ - вымернасць, -ці ж; ~ИТЕЛЬ - вымяральнік, -ка м, вымернік, -ка м; ~ИТЕЛЬНЫЙ - вымяральны, вымерны; ~ительная посуда - вымяральная пасуда /посуд/; ~ИТЬ - змераць, вымераць; павымяраць; абмераць; ~ЯТЬ - мераць, вымерваць, вымяраць, абмерваць, абмяраць.

ИЗОАМИЛОВЫЙ - ізаамілавы; и. спирт - ізаамілавы спірт.

ИЗОБРАЖ//АТЬ - адлюстроўваць; выяўляць; ~ЕНИЕ - адлюстраванне,-ння н; выяўленне, -ння н.

ИЗОБУТИЛЕН - ізабутылен, -ну м.

ИЗОИОНИЯ - ізаіанія, -ніі ж.

ИЗОЛЕЙЦИН - ізалейцын, -ну м.

ИЗОЛИР//ОВАНИЕ - ізаляванне, -ння н; ~ОВАННО - ізалявана; ~ОВАННЫЙ - ізаляваны; ~ОВАТЬ - ізаляваць.

ИЗОЛЯ//ТОР - ізалятар, -ра м; ~ЦИЯ - ізаляцыя, -цыі ж.

ИЗОМЕР - ізамер, -ра м; ~ИЗАЦИЯ - ізамерызацыя, -цыі ж; ~ИЯ -ізамерыя, -рыі ж; ~ия зеркальная - ізамерыя люстраная; ~ия ионизационная - ізамерыя іанізацыйная; ~ия координационная - ізамерыя каардынацыйная; ~ия пространственная - ізамерыя прасторавая; ~ия структурная - ізамерыя структурная.

ИЗОМОРФИЗМ - ізамарфізм, -му м.

ИЗОМОРФНЫЙ -ізаморфны.

ИЗОПРЕН - ізапрэн, -ну м; ~ОВЫЙ -ізапрэнавы.

ИЗОПРИЛОВЫЙ - ізапрылавы.

ИЗОТЕРМА - ізатэрма, -мы ж; и. адсорбции - ізатэрма адсорбцыі.

ИЗОТОНИЧЕСКИЙ: и. коэффициент - ізатанічны каэфіцыент.

ИЗОТОП - ізатоп, -пу м; ~НЫЙ - ізатопны; ~ный анализ - ізатопны аналіз.

ИЗРЯДНО - парадкам, досыць /даволі/ шмат; дастаткова.

ИЗЪЯН - недахоп, -пу м; дэфект, -ту м.

ИЛЛЮСТР//АЦИЯ - ілюстрацыя; -цыі ж, ~ИРОВАТЬ - ілюстраваць.

ИМЕНИТЫЙ - знакаміты, важны; славуты.

ИМИДЫ - іміды, -даў мн.

ИМИТ//АТОР - імітатар, -ра м; ~АЦИЯ -імітацыя, -цыі ж; ~ИРОВАНИЕ -імітаванне, -ння н; ~ИРОВАННЫЙ - імітаваны; ~ИРОВАТЬ - імітаваць.

ИМИТЫ - іміты, -таў мн.

ИММУНОХИМИЯ - імунахімія, -міі ж.

ИМПУЛЬС - імпульс, -су м; ~ИВНЫЙ - імпульсіўны; ~НЫЙ - імпульсны.

ИНВЕРС//ИОННЫЙ - інверсійны; ~ионный сахар - інверсійны цукар; ~ИЯ - інверсія, -сіі ж.

ИНВЕРТИН - інверцін, -ну м.

ИНГИБИТОР - інгібітар, -ру м.

ИНДЕКС - індэкс, -са м.

ИНДИВИДУАЛЬН//ОСТЬ - індывідуальнасць, -ці ж; ~ЫЙ - індывідуальны.

ИНДИГОИД - індыгоід, -ду м; ~НЫЙ - індыгоідны.

ИНД//ИЕВЫЙ - індыевы; ~ИЙ - індый, -дыю м.

ИНДИКАТОР - індыкатар, -ра м; ~НЫЙ - індыкатарны; ~ная мощность -індыкатарная магутнасць.

ИНДИФЕРЕНТН//ОСТЬ - індыферэнтнасць, -ці ж; ~ЫЙ - індыферэнтны.

ИНДОКСИЛ - індаксіл, -лу м.

ИНДОЛ - індол, -лу м.

ИНДУКЦ//ИОННЫЙ - індукцыйны; ~ионный эффект - індукцыйны эфект; ~ИЯ - індукцыя, -цыі ж.

ИНЕРТН//ОСТЬ - інертнасць, -ці ж; ~ЫЙ - інертны; ~ые газы - інертныя газы.

ИНИЦИ//АТОР - ініцыятар, -ра м; ~ИРОВАННЫЙ - ініцыяваны; ~ИРОВАТЬ-ініцыяваць.

ИНОЗИН - іназін, -ну м; ~ОВЫЙ - іназінавы.

ИНОЗИТ - іназіт, -ту м.

ИНСЕКТИЦИД - інсектыцыд, -ду м; ~НЫЙ -інсектыцыдны.

ИНТЕНСИВН//ОСТЬ - інтэнсіўнасць, -ці ж; ~ЫЙ - інтэнсіўны.

ИНТЕРВАЛ - інтэрвал, -лу м.

ИНТЕРПОЛ//ИРОВАННЫЙ - інтэрпаляваны; ~ИРОВАТЬ - інтэрпаляваць; ~ЯТОР - інтэрпалятар, -ра м; ~ЯЦИОННЫЙ - інтэрпаляцыйны; ~ЯЦИЯ - інтэрпаляцыя, -цыі ж.

ИНУЛИН - інулін, -ну м.

ИНФРАКРАСН//ЫЙ - інфрачырвоны; ~ое излучение - інфрачырвонае выпраменьванне; ~ые лучи - інфрачырвоныя праменi; ~ая спектроскопия - інфрачырвоная спектраскапія.

ИОН - іон, іона м; ~ИЗАЦИЯ - іанізацыя, -цыі ж; ~ИЗИРОВАННЫЙ - іанізаваны; ~ИЗИРОВАТЬ - іанізаваць; ~ИЗИРУЮЩИЙ - іанізуючы.

ИОНИЙ - іоній, -нію м.

ИОНИТ - іаніт, -ту м; ~НЫЙ - іанітны; ~ОВЫЙ - іанітавы.

ИОНН//ЫЙ - іонны; и. обмен - іонны абмен; и. радиус - іонны радыус; ~ая связь - іонная сувязь; ~ая сила раствора - іонная сіла раствору; ~ые кристаллы - іонныя

крышталі; ~ые реакции -іонныя рэакцыі; ~ые пары - іонная пара; ~ое произведение воды -іонны здабытак вады.

ИОННО-МОЛЕКУЛЯРН//ЫЙ: ~ые уравнения реакций - іонна-малекулярныя ўраўненні рэакцый.

ИОНОМЕРЫ - іонамеры, -раў мн.

ИОНООБМЕН - іонаабмен, -ну м; ~НЫЙ - іонаабменны; ~ная хроматография - іонаабменная храматаграфія; ~ые смолы- іонаабменныя смолы.

ИОНОСЕЛЕКТИВН//ЫЙ: ~ые электроды - іонаселектыўныя электроды.

ИОНОСФЕР//А - іанасфера, -ры ж; ~НЫЙ -іанасферны.

ИПРИТ - іпрыт, -ту м;~ОВЫЙ - іпрытавы.

ИРИД//ИЕВЫЙ - ірыдыевы; ~ИЙ - ірыдый, -дыю м.

ИСКЛЮЧ//АТЬ - выключаць; ~ЕНИЕ - выключэнне, -ння н; ~ИТЕЛЬНЫЙ-выключны; надзвычайны.

ИСКОМ//ОЕ - шукаемае, -мага н; ~ЫЙ -шукаемы; ~ая величина - шукаемая велічыня.

ИСПАР//ЕНИЕ - выпарэнне, -ння н; выпарванне, -ння н; ~ИТЕЛЬ - выпарнік, -ка м; ~ИТЬ - выпарыць; ~ИТЬСЯ - выпарыцца; ~ЯТЬСЯ -выпарвацца.

ИСПОЛЬЗОВА//НИЕ - выкарыстанне, -ння н; выкарыстоўванне, -ння н;~ННЫЙ - выкарыстаны, скарыстаны; ужыты; ~ТЬ - выкарыстаць,скарыстаць; ужыць.

ИСПОРТИТЬ - сапсаваць; папсаваць; пашкодзіць; ~СЯ - сапсавацца; папсавацца.

ИСПРАВИТЬ - паправіць, адрамантаваць.

ИСПЫТАН//ИЕ - выпрабаванне, -ння н; выпрабоўванне; -ння н; проба,-бы ж;~НЫЙ - выпрабаваны, правераны.

ИСПЫТАТЬ - выпрабаваць, праверыць, зрабіць іспыты; даследаваць.

ИССЛЕД//ОВАНИЕ - даследаванне, -ння н; дослед, -ду м;~ОВАННЫЙ -даследаваны; ~ОВАТЕЛЬ - даследчык, -ка м; ~ОВАТЕЛЬСКИЙ -доследны; даследчы; ~овательская работа - доследная работа;~овательский метод - метад даследавання; ~ОВАТЬ -даследаваць;~УЕМЫЙ - даследуемы.

ИСТИН//А - ісціна, -ны ж; праўда, -ды ж; ~НЫЙ - праўдзівы, сапраўдны.

ИСТОЧНИК - крыніца, -цы ж; и. постоянного тока - крыніца пастаяннага току.

ИСТРАТИТЬ - страціць, патраціць; выдаткаваць.

ИСХОД - выхад, -ду м; выйсце, -ця н; ~ИТЬ -выходзіць, паходзіць;~НЫЙ - зыходны; ~ные продукты - зыходныя рэчывы.

ИСЧЕЗ//АНИЕ - знікненне, -ння н; ~АТЬ - знікаць; ~НОВЕНИЕ - знікненне, -ння н; ~НУТЬ - знікнуць.

ИСЧЕРПА//ННЫЙ - вычарпаны; ~ТЬ -вычарпаць; ~ТЬСЯ - вычарпацца.

ИТОГ - вынік, -ку м; падрахунак, -нку м.

ИТТЕРБ//ИЕВЫЙ - ітэрбіевы; ~ИЙ - ітэрбій, -бію м.

ИТТР//ИЕВЫЙ - ітрыевы; ~ИЙ - ітрый, -рыю м.

Й

ЙОД - ёд, ёду м; ~ИД -ёдыд, -ду м; ~ИРОВАННЫЙ - ёдаваны; ~ИСТОСТЬ - ёдзістасць, -ці ж; ~ИСТЫЙ -ёдзісты; ~НОВАТЫЙ -ёднаваты; ~НЫЙ - ёдны; ~ное число - ёдны лік.

ЙОДОМЕТРИЯ - ёдаметрыя, -рыі ж.

ЙОДОФОРМ - ёдаформ, -му м.

К

КАДАВЕРИН - кадаверын, -ну м.

КАДМ//ИЕВЫЙ - кадміевы; ~ИЙ - кадмій, -мію м; ~ИРОВАНИЕ - кадміраванне, -ння н.

КАЖУЩИЙСЯ - уяўны.

КАЗЕИН - казеін, -ну м; ~ОВЫЙ - казеінавы.

КАИНИТ - каініт, -ту м.

КАЛЕН//ИЕ - напал, -лу м; красное ~ие -чырвоны напал; белое ~ие -белы напал; до белого ~ия - да белага напалу; ~НЫЙ - гарачы, напалены.

КАЛИБРОВ//АНИЕ - калібраванне, -ння н; ~АННЫЙ - каліграваны;~АТЬ - калібраваць; ~АТЬСЯ - калібравацца; ~КА - каліброўка, -кі ж; ~ОЧНЫЙ - калібровачны.

КАЛ//ИЕВЫЙ - каліевы; ~ИЙ - калій, -лію м; ~ИЙНЫЙ - калійны;~ийные удобрения - калійныя ўгнаенні.

КАЛИЛЬ//НЫЙ - гартавальны, напальны; ~ная лампа - напальная лямпа; ~ная печь - гартавальная печ.

КАЛОМЕЛЬ - каламель, -лі ж.

КАЛОРИЙН//ОСТЬ - каларыйнасць, -ці ж; ~ЫЙ - каларыйны.

КАЛОРИМЕТРИЯ - каларыметрыя, -рыі ж.

КАЛОРИЯ - калорыя, -рыі ж.

КАЛЬЦ//ИЕВЫЙ - кальцыевы; ~ИЙ - кальцый, -цыю м; ~ИНАЦИЯ -кальцынацыя, -цыі ж; ~ИНИРОВАНИЕ - кальцыніраванне, -ння н; ~ИНИРОВАННЫЙ - кальцыніраваны; ~инированная сода - кальцыніраваная сода; ~ИТ - кальцыт, -ту м.

КАМЕДЬ - камедзь, -дзі ж.

КАМЕННОУГОЛЬ//НЫЙ - каменнавугальны; ~ная смола - каменнавугальная смала.

КАМЕННЫЙ - каменны; ~ная соль - каменная соль; к. уголь - каменны вугаль.

КАМПЕШ - кампеш, -шу м; ~ЕВЫЙ - кампешавы.

КАМФАР//А - камфара, -ры ж; ~НЫЙ - камфорны, камфоравы; ~ный спирт - камфорны спірт.

КАНИФОЛЬ - каніфоль, -лі ж; ~НЫЙ - каніфольны.

КАНЦЕРОГЕН - канцэраген, -ну м.

КАОЛИН - каалін, -ну м; ~ИТ - каалініт, -ту м; ~ОВЫЙ - каалінавы.

КАПЕЛЬНИК - кропельнік, -ка м.

КАПЕЛЬНИЦА - кропельніца, -цы ж.

КАПЕЛЬНОЖИ́ДКИЙ - кропельнава́дкі.

КА́П//ЕЛЬНЫЙ - кро́пельны; к. ана́лиз - кро́пельны ана́ліз; ~ЛЯ - кро́пля, -лі ж.

КАПИЛЛЯ́Р - капіля́р, -ра м; ~НОСТЬ - капіля́рнасць, -ці ж; ~НЫЙ -капіля́рны; ~ные явле́ния - капіля́рныя з'я́вы.

КАПЛЕ//ВИ́ДНЫЙ, ~ОБРА́ЗНЫЙ - каплепадо́бны, кроплепадо́бны.

КАПРОЛАКТА́М - капралакта́м, -му м; ~ОВЫЙ - капралакта́мавы.

КАПРО́Н - капро́н, -ну м; ~ОВЫЙ - капро́навы.

КАРАНДА́Ш - каранда́ш, -ша́ м; ало́вак, -ўка м;к. для стекла́ - ало́вак на шкло́.

КАРБАМИ́Д - карбамі́д, -ду м; ~НЫЙ - карбамі́дны.

КАРБИ́Д - карбі́д, -ду м; ~НЫЙ - карбі́дны, карбі́давы.

КАРБОКСИ́Л - карбаксі́л, -лу м; ~ЬНЫЙ - карбаксі́льны; ~ьная гру́ппа- карбаксі́льная гру́па.

КАРБОЛ//И́Т - карбалі́т, -ту м; ~И́ТОВЫЙ - карбалі́тавы; ~КА - карбо́лка, -кі ж; ~ОВЫЙ - карбо́лавы; ~овая кислота́ - карбо́лавая кіслата́.

КАРБОНА́Т - карбана́т, -ту м; ~НЫЙ - карбана́тны.

КАРБОНИЗ//АЦИО́ННЫЙ - карбанізацы́йны; ~А́ЦИЯ - карбаніза́цыя, -цыі ж; ~И́РОВАТЬ - карбанізава́ць.

КАРБОНИ́Л - карбані́л, -лу м; ~ИЛИ́РОВАНИЕ - карбанілі́раванне, -ння н; ~ЬНЫЙ - карбані́льны; ~ьная гру́ппа - карбані́льная гру́па; ~ОВЫЙ - карбані́лавы.

КАРБОНИ́Т - карбані́т, -ту м.

КАРБОРУ́НД - карбару́нд, -ду м; ~ОВЫЙ - карбару́ндавы.

КАРБОФО́С - карбафо́с, -су м; ~НЫЙ - карбафо́сны.

КАРКА́С - карка́с, -са м; ~НЫЙ - карка́сны.

КАТАБОЛИ́ЗМ - катабалі́зм, -му м.

КАТА́ЛИ//З - ката́ліз, -зу м;~ЗА́ТОР - каталіза́тар, -ра м; ~ЗИ́РОВАТЬ- каталізава́ць; ~ТИ́ЧЕСКИЙ - каталіты́чны; ~ти́ческий кре́кинг - каталіты́чны крэ́кінг; ~ти́ческая акти́вность - каталіты́чная акты́ўнасць; ~ти́ческие я́ды - каталіты́чныя атру́ты /я́ды/.

КАТАФОРЕ́З - катафарэ́з, -зу м.

КАТИО́Н - катыён, -на м; ~И́Т - катыяні́т, -та м; ~НЫЙ - катыённы.

КАТИОНООБМЕ́Н//НЫЙ: ~ные смо́лы - катыёнаабме́нныя смо́лы.

КАТО́Д - като́д, -да м; ~НЫЙ - като́дны; ~ный проце́сс - като́дны працэ́с; ~ ное распыле́ние - като́днае распыле́нне.

КА́УСТИК - ка́ўстык, -ку м.

КАУСТИ//ФИКА́ЦИЯ - каўстыфіка́цыя, -цыі ж; ~ЧЕСКИЙ - каўсты́чны;~ческая со́да - каўсты́чная со́да.

КАУЧУ́К - каўчу́к, -ку́ м; к. приро́дный - каўчу́к натура́льны /прыро́дны/; к.синтети́ческий - каўчу́к сінтэты́чны; ~ОВЫЙ - каўчу́кавы.

КАЧА́//НИЕ - пампава́нне, -ння н; ~ТЬ - пампава́ць.

КАЧЕСТ//ВЕННЫЙ - якасны; к. анализ - якасны аналіз; ~ВО - якасць,-ці ж.

КАШЕ//ОБРАЗНЫЙ , ~ПОДОБНЫЙ - кашападобны.

КВАНТ - квант, кванта м; ~ОВЫЙ - квантавы; ~овая механика -квантавая механіка; ~овая химия - квантавая хімія; ~овые числа -квантавыя лікі /лічбы/; ~овый выход - квантавы выхад; ~ОВАНИЕ - квантаванне, -ння н; правила ~ования - правілы квантавання.

КВАРЦ - кварц, кварцу м; ~ЕВАТЬ - кварцаваць; ~ЕВЫЙ - кварцавы;~евое стекло - кварцавае шкло; ~ИТ - кварцыт, -ту м; ~ИТОВЫЙ -кварцытавы.

КВАСЦ//ОВЫЙ - галыновы; ~Ы - галын, -ну м; ~ы алюмокалиевые - галын алюмакаліевы; ~ы хромокалиевые - галын хромакаліевы.

КЕРАМИ//КА - кераміка, -кі ж; ~ЧЕСКИЙ - керамічны; ~ческое производство - керамічная вытворчасць; ~ческие изделия - керамічныя вырабы.

КЕРОСИН - газа, - зы ж; ~НЫЙ , ~ОВЫЙ - газавы, газны.

КЕТОН - кетон, -ну м.

КИБЕРНЕТИ//КА - кібернетыка, -кі ж; ~ЧЕСКИЙ - кібернетычны.

КИНЕТИ//КА - кінетыка, -кі ж; ~ЧЕСКИЙ - кінетычны; ~ческая устойчивость - кінетычная устойлівасць; ~ческое уравнение - кінетычнае ўраўненне.

КИНОВАРЬ - кінавар, -ры ж.

КИПЕЛКИ - кіпелкі, -каў мн.

КИПЕ//НИЕ - кіпенне, -ння н; температура ~ния - тэмпература кіпення; ~ТЬ - кіпець.

КИПЯТ//ИЛЬНИК - кіпяцільнік, -ка м; ~ИТЬ - кіпяціць; ~ОК - кіпень, -пню м, кіпецень, -тню м, вар, вару м.

КИПЯ//ЧЕНИЕ - кіпячэнне, -ння н; ~ЁННЫЙ, ~ЁНЫЙ - кіпячоны; ~ЩИЙ -кіпячы; ~щий слой - кіпячы слой.

КИРПИЧ - цэгла, -лы ж; ~ИНА - цагліна, -ны ж; ~НЫЙ - цагельны.

КИСЛОРОД - кісларод, -ду м; ~ИСТЫЙ - кіслародзісты; ~НЫЙ -кіслародны.

КИСЛОРОДОСОДЕРЖАЩИЙ - кіслародазмяшчальны.

КИСЛ//ОТА - кіслата, -ты ж; ~ОТНОСТЬ - кіслотнасць, -ці ж; ~ОТНЫЙ- кіслотны; ~отный оксид - кіслотны аксід; ~отная /кислая/ среда -кіслотнае /кіслае/ асяроддзе; ~отное число - кіслотны лік, кіслотная лічба; ~ОТОМЕР - кіслатамер, -ра м.

КИСЛОТООБРАЗУЮЩИЙ - кіслотаўтваральны.

КИС//ЛЫЙ - кіслы; ~лая соль - кіслая соль.

КЛАССИФИ//КАЦИЯ - класіфікацыя, -цыі ж; ~ЦИРОВАТЬ - класіфікаваць.

КЛАСТЕРЫ - класцеры, -раў мн.

КЛАТРАТЫ - клатраты, -таў мн.

КЛЕЙ - клей, клею м; ~КИЙ - клейкі; ліпкі; ~СТЕР - клейстар, -ру м.

КЛЕТЧАТКА - клятчатка, -кі ж.

КОАГУЛ//ИРОВАНИЕ - каагуляванне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - каагуляваць;~ЯНТ - каагулянт, -ту м; ~ЯТ - каагулят, -ту м; ~ЯЦИЯ - каагуляцыя, -цыі ж; порог ~яции - парог каагуляцыі.

КОАЛЕСЦЕНЦИЯ - каалесцэнцыя, -цыі ж.

КОАЦЕРВАЦИЯ - каацэрвацыя, -цыі ж.

КОБАЛЬТ - кобальт, -ту м; ~ОВЫЙ - кобальтавы.

КОВАЛЕНТН//ОСТЬ - кавалентнасць, -ці ж; ~ЫЙ - кавалентны; ~ая связь - кавалентная сувязь.

КОВК//ИЙ - коўкі; ~ОСТЬ - коўкасць, -ці ж.

КОГЕЗИЯ - кагезія, -зіі ж.

КОКАИН - какаін, -ну м; ~ОВЫЙ - какаінавы.

КОКС - кокс, -су м.

КОКСОБЕНЗОЛ - коксабензол, -лу м;~ЬНЫЙ - коксабензольны.

КОКС//ОВАНИЕ - каксаванне, -ння н; ~ОВАННЫЙ - каксаваны; ~ОВАТЬ -каксаваць; ~ОВЫЙ - коксавы.

КОКСОГАЗОВЫЙ - коксагазавы.

КОКСОХИМ//ИК - коксахімік, -ка м; ~ИЧЕСКИЙ - коксахімічны; ~ИЯ -коксахімія, -міі ж.

КОКСУЮ//ЩИЙСЯ - каксаўны; ~щиеся угли - каксаўныя вугалі.

КОЛБА - колба, -бы ж.

КОЛЕБА//НИЕ - калыханне, -ння н; хістанне, -ння н; ваганне, -ння н; к. волны - калыханне хвалі; к.температуры - хістанне тэмпературы; к. молекул - ваганне малекул; ~ТЕЛЬНЫЙ - калыхальны;хістальны; вагальны; ~тельные спектры - вагальныя спектры.

КОЛИЧЕСТ//ВЕННЫЙ - колькасны; ~венный анализ - колькасны аналіз;~ВО - колькасць, -ці ж.

КОЛЛАГЕН - калаген, -ну м.

КОЛЛОДИЙ - калодый, -дыю м.

КОЛЛОИД - калоід, -ду м; ~АЛЬНОСТЬ - калаідальнасць, -ці ж; ~АЛЬНЫЙ - калаідальны; ~НЫЙ - калоідны; ~ная химия - калоідная хімія; ~ные растворы - калоідныя растворы; ~ные системы-калоідныя сістэмы.

КОЛОННА - калона, -ны ж; к. синтеза - калона сінтэзу.

КОЛОНООБРАЗНЫЙ - калонападобны.

КОЛОРИМЕТР - каларыметр, -ра м; ~ИЧЕСКИЙ - каларыметрычны; ~ИЯ - каларыметрыя, -рыі ж.

КОЛЧЕДАН - калчадан, -ну м; ~НЫЙ - калчаданны, калчаданавы.

КОЛЬЦО - кольца, -ца н.

КОЛЬЧУГАЛЮМИНИЙ - кальчугалюміній, -нію м.

КОМБИНАЦ//ИОННЫЙ - камбінацыйны; ~ИЯ - камбінацыя, -цыі ж.

КОМБИНИРОВА//ННЫЙ - камбінаваны; ~ТЬ - камбінаваць.

КОМОК - камяк, -ка м; камячок, -чка м.

КОМПЕНС//АТОР - кампенсатар, -ра м; ~АЦИОННЫЙ - кампенсацыйны; ~АЦИЯ - кампенсацыя, -цыі ж; ~ИРОВАННЫЙ - кампенсаваны; ~ИРОВАТЬ- кампенсаваць; ~ИРОВАТЬСЯ - кампенсавацца.

КОМПЛЕКС - комплекс, -су м; ~НЫЙ - комплексны; ~ные соединения -комплексныя злучэнні; ~ОНЫ - камплексоны, -наў мн.

КОМПЛЕКСОМЕТРИЯ - комплексаметрыя, -рыі ж.

КОМПЛЕКСОНОМЕТРИЯ - комплексонаметрыя, -рыі ж.

КОМПЛЕКСООБРАЗОВАТЕЛЬ - комплексаўтваральнік, -ка м.

КОМПОЗИЦИОН//НЫЙ: ~ные материалы - кампазіцыйныя матэрыялы.

КОМПОНЕНТ - кампанент, -та м.

КОМПРЕССОР - кампрэсар, -ра м; ~НЫЙ - кампрэсарны.

КОНВЕНКЦИЯ - канвенкцыя, -цыі ж.

КОНВЕРТЕР - канвертар, -ра м; ~НЫЙ канвертарны; ~ный процесс - канвертарны працэс.

КОНДЕНС//АТОР - кандэнсатар; -ра м; ~АТ - кандэнсат, -ту м;~АЦИЯ- кандэнсацыя, -цыі ж; ~ИРОВАНИЕ - кандэнсаванне, -ннян;~ИРОВАТЬСЯ - кандэнсавацца; ~ИРОВАННЫЙ - кандэнсаваны;~ированное состояние - кандэнсаваны стан.

КОНДУКТОМЕТР//ИЯ - кандуктаметрыя, -рыі ж; ~ИЧЕСКИЙ - кандуктаметрычны; ~ическое титрование - кандуктаметрычнае цітраванне.

КОНЕЧН//ЫЙ - канчатковы; в ~ом счёте - у канчатковым выніку.

КОНКУР//ЕНТНЫЙ - канкурэнтны; ~ЕНТОСПОСОБНОСТЬ -канкурэнтаздольнасць, -ці ж; ~ЕНТОСПОСОБНЫЙ - канкурэнтаздольны;~ЕНЦИЯ - канкурэнцыя, -цыі ж; ~ИРОВАТЬ - канкурыраваць; ~ИРУЮЩИЙ- канкурыруючы; ~ирующий процесс - канкурыруючы працэс.

КОНСЕРВАЦИЯ - кансервацыя, -цыі ж.

КОНСТАНТА - канстанта, -ты ж; к.гидролиза - канстанта гідролізу; к. диссоциации - канстанта дысацыяцыі; к. нестойкости - канстанта нястойкасці, нетрываласці /няўстойлівасці/; к. равновесия - канстанта раўнавагі; к. скорости - канстанта скорасці /хуткасці/.

КОНТАКТ - кантакт, -ту м;~НЫЙ - кантактавы, кантактны; ~ное вещество - кантактнае рэчыва; ~ная коррозия - кантактавая карозія.

КОНТРАСТ - кантраст, -ту м; ~ИРОВАТЬ - кантраставаць; ~НОСТЬ -кантраснасць, -ці ж;~НЫЙ - кантрасны.

КОНТРОЛЬНО-ИЗМЕРИТЕЛЬНЫЙ - кантрольна-вымяральны.

КОНТУР - контур, -ру м; ~НЫЙ - контурны.

КОНФИГУРАЦИЯ - канфігурацыя, -цыі ж; к.устойчивая - канфігурацыя ўстойлівая; к. неустойчивая - канфігурацыя няўстойлівая.

КОНФОРМАЦИЯ - канфармацыя, -цыі ж.

КОНЦЕНТР//АЦИЯ - канцэнтрацыя, -цыі ж; ~АЦИОННЫЙ - канцэнтрацыйны; ~ИРОВАНИЕ - канцэнтраванне, -ння н; ~ИРОВАННЫЙ - канцэнтраваны; ~ИРОВАТЬ - канцэнтраваць.

КОНЦЕНТРИЧН//ОСТЬ - канцэнтрычнасць, -ці ж;~ЫЙ - канцэнтрычны.

КООРДИН//АТА - каардыната, -ты ж; ~АЦИЯ - каардынацыя,-цыі ж;~ИРОВАТЬ - каардынаваць; ~АЦИОННЫЙ - каардынацыйны; ~ационная связь - каардынацыйная сувязь; ~ационное число - каардынацыйны лік.

КОПОТЬ - сажа, -жы ж, куродым, -му м.

КОПТ//ЕТЬ - закурвацца; ~ЯЩИЙ:~ящее пламя - полымя, якое курыць.

КОРДИТ - кардыт, -ту м.

КОРИЧНЕВ//АТЫЙ - карычняваты, рудаваты; ~ЫЙ - карычневы, руды.

КОРПУСКУЛ//А - карпускула, -лы ж; ~ЯРНЫЙ - карпускулярны.

КОРПУСКУЛЯРНО - ВОЛНО//ВОЙ: ~вая природа электрона -карпускулярна-хвалевая прырода электрона.

КОРРЕЛ//ЯЦИЯ - карэляцыя, -цыі ж; ~ИРОВАТЬ - карэляваць;~ЯЦИОННЫЙ - карэляцыйны; ~яционные соотношения - карэляцыйныя суадносіны.

КОРРОДИРОВАТЬ - карадзіраваць.

КОРРОЗ//ИЙНЫЙ, ~ИОННЫЙ -каразійны; ~ионная стойкость - каразійная стойкасць; ~ионная усталость - каразійная стомленасць.

КОРРОЗИОННОСТОЙ//КИЙ: ~кие сплавы - каразійнастойкія сплавы.

КОРРОЗИЯ - карозія, -зіі ж.

КОРУНД - карунд, -ду м; ~ОВЫЙ - карундавы.

КОСВЕННЫЙ - ускосны.

КОСМИЧЕС//КИЙ: ~кая химия - касмічная хімія.

КОСМОХИМИЯ - космахімія, -міі ж.

КОФЕРМЕНТЫ - каферменты, -таў мн.

КОШЕНИ//ЛЕВЫЙ - кашанілевы; ~ЛЬ - кашаніль, -лі ж; ~ЛЬНЫЙ -кашанільны.

КОЭФФИЦИЕНТ - каэфіцыент, -та м; к. преломления света - каэфіцыент праламлення святла.

КРАПП - крап, крапу м.

КРАСИ//ТЕЛЬ - фарбавальнік, -ка м; ~ТЬ -фарбаваць.

КРАСКА - фарба, -бы ж; колер, -ру м.

КРАСНЕТЬ - чырванець.

КРАСНО-БУРЫЙ - чырвонабуры.

КРАСНОВАТЫЙ - чырванаваты.

КРАСЯЩ//ИЙ - фарбавальны; ~ее вещество - фарбавальнае рэчыва, фарбавальнік.

КРАТКИЙ - кароткі, сціслы.

КРАТН//ОСТЬ - кратнасць, -ці ж; ~ЫЙ - кратны; ~ые связи - кратныя сувязі.

КРАШЕН//ИЕ - фарбаванне, -ння н; ~НЫЙ - фарбаваны, пафарбаваны.

КРАХМАЛ - крухмал, -лу м; ~ИСТЫЙ - крухмалісты; ~ЬНЫЙ -крухмальны.

КРЕАТИН - крэацін, -ну м; ~ИН - крэацінін, -ну м.

КРЕЗОЛ - крэзол, -лу м.

КРЕКИНГ - крэкінг, -гу м; к. - процесс - крэкінг-працэс, -су м.

КРЕМНЕЗЁМ - крэменязём, -му м; ~ИСТЫЙ - крэменязёмісты; ~НЫЙ-крэменязёмны.

КРЕМЕНЕКИСЛЫЙ - крэменякіслы.

КРЕМН//ИЕВЫЙ - крэмніевы; ~иевая кислота - крэмніевая кіслата,~ИЙ - крэмній, -нію м.

КРЕМНИЙОРГАНИЧЕС//КИЙ: ~кие соединения - крэм-

нійарганічныя злучэнні; ~кие полимеры - крэмнійарганічныя палімеры.

КРЕМНИЙФТОРИСТОВОДОРОД//НЫЙ: ~ная кислота - крэмнійфторыставадародная кіслата.

КРЕОЗОЛ - крэазол, -лу м.

КРЕОЗОТ - крэазот, -ту м; ~ОВЫЙ - крэазотавы.

КРЕОЛИН - крэалін, -ну м.

КРИОГЕННЫЙ - крыягенны.

КРИОЛИТ - крыяліт, -ту м.

КРИОЛОГИЯ - крыялогія, -гіі ж.

КРИОСКОП//ИЯ - крыяскапія, -піі ж; ~ИЧЕСКИЙ: ~ическая постоянная- крыяскапічная пастаянная.

КРИПТОН - крыптон, -ну м.

КРИСТАЛЛ - крышталь, ~ля м; ~ИЗАТОР - крышталізатар, -ра м;~ИЗАЦИОННЫЙ - крышталізацыйны; ~ИЗАЦИЯ - крышталізацыя, -цыі ж;~ИЗИРОВАТЬ - крышталізаваць; ~ИЗОВАННЫЙ - крышталізаваны;~ИЗОВАТЬ - крышталізаваць; ~ИЗОВАТЬСЯ - крышталізавацца; ~ИТ - крышталіт, -ту м; ~ИЧЕСКИЙ - крышталічны; ~ическая решётка - крышталічная рашотка.

КРИСТАЛЛОВИДНЫЙ - крышталепадобны.

КРИСТАЛЛОГИДРАТ - крышталегідрат, -ту м.

КРИСТАЛЛОХИМИЯ - крышталяхімія, -міі ж.

КРИТЕРИЙ - крытэрый, -рыю м.

КРИТИЧЕС//КИЙ - крытычны; ~кое состояние - крытычны стан.

КРОВАВО-КРАСНЫЙ - крывава- чырвоны, крывава-барвовы.

КРОНОВ//ЫЙ - кронавы; ~ая краска - кронавая фарба.

КРОХОТНЫЙ - малюсенькі, маленькі.

КРОШЕ//ВО - крышаніна, -ны ж; мешаніна, -ны ж; ~НИЕ - крышэнне,-ння н; ~ННЫЙ, ~НЫЙ - крышаны.

КРОШЕЧНЫЙ - малюсенькі, маленькі.

КРУГОВОРОТ - кругаварот, -ту м.

КРУЖКА -конаўка, -кі ж; кубак ,-бка м.

КРУЖОК - гурток, -тка м.

КРУПИ//НКА - крупінка, -кі ж; драбок, -бка м; к. соли -драбок солі; ~ЧАТЫЙ - крупчасты.

КРУПНОЗЕРНИСТЫЙ - буйназярністы.

КРУПНОПОРИСТЫЙ - буйнапорысты.

КРЫШКА - накрыўка, -кі ж.

КСЕНОН - ксенон, -ну м.

КСЕРОФОРМ - ксераформ, -му м.

КСИЛОЛ - ксілол, -лу м.

КУЛОН - кулон, -на м.

КУЛОНОМЕТРИЯ - кулонаметрыя, -рыі ж.

КУМАРИН -кумарын, -ну м.

КУПАЖ - купаж, -жу м.

КУПОРОС - купарвас, -су м; ~НЫЙ - купарвасны; ~ОВЫЙ - купарвасавы.

КУРЧАТ//ОВИЙ - курчатовій, -вію м.

КЮВЕТА - кювета, -ты ж.

КЮРИ - кюры, нескл. н.

КЮРИЙ - кюрый, -рыю м.

Л

ЛАБОРАНТ - лабарант, -та м; ~КА - лабарантка, -ткі ж; ~СКИЙ -лабаранцкі.

ЛАБОРАТОР//ИЯ - лабараторыя, -рыі ж; ~НЫЙ - лабараторны; ~ный способ получения - лабараторны спосаб атрымоўвання.

ЛАВСАН - лаўсан, -ну м; /лабараторыя высокамалекулярных злучэнняў Акадэміі навук/; ~ОВЫЙ - лаўсанавы.

ЛАЗЕР - лазер, -ра м; ~НЫЙ - лазерны; ~ная спектроскопия - лазерная спектраскапія.

ЛАЗОРЕВЫЙ - блакітны.

ЛАЗУ//РЕВЫЙ: л. камень - ляпіс-лазурак; ~РИТ - лазурыт, -ту м;~РНЫЙ - блакітны; ~РЬ - 1. блакіт, -ту м; 2. лазурак, -рку м; ~рь берлинская - берлінскі лазурак /фарба/.

ЛАК - лак, лаку м.

ЛАКИРОВА//НИЕ - лакіраванне, -ння н, лакіроўка, -кі ж; ~ТЬ - лакіраваць.

ЛАКМУС - лакмус, -су м; ~ОВЫЙ - лакмусавы; ~овая бумажка -лакмусавая паперка.

ЛАКОКРАСОЧ//НЫЙ - лакафарбавы; ~ные материалы - лакафарбавыя матэрыялы.

ЛАКТОЗА - лактоза, -зы ж.

ЛАМПА - лямпа, -пы ж; предохранительная л. - засцерагальная лямпа; калильная л. - напальная лямпа.

ЛАНТАН - лантан, -ну м; ~ОИД - лантаноід, -ду м.

ЛАТЕКС - латэкс, -су м.

ЛАТУ//ННЫЙ - латунны, латуніевы, масянжовы; ~НЬ - латунь, -ні ж, мосенж, -жу м.

ЛЕВУЛЁЗА - левулёза; -зы ж.

ЛЕГИРОВАН//ИЕ - легіраванне, -ння н; ~НЫЙ - легіраваны; ~ная сталь - легіраваная сталь.

ЛЕГКОВОСПЛАМЕНЯЮЩИЙСЯ - лёгкі на загаранне; палкі.

ЛЕГКОЗАМЕНЯЕМЫЙ - лёгказамяняльны.

ЛЕГКОПЛАВК//ИЙ - лёгкаплаўкі; ~ОСТЬ - легкаплаўкасць, -ці ж.

ЛЕГКОРАСТВОРИМЫЙ - лёгкараствараляльны.

ЛЕГКОУЛЕТУЧИВАЮЩИЙСЯ - лёгкавыпарны, лёгкавыпаральны.

ЛЕЗВИЕ - лязо, -за н.

ЛЕЙКА - лейка, -кі ж.

ЛЕЙКОСОЕДИНЕНИЕ - лейказлучэнне, -ння н.

ЛЕЙЦИН - лейцын, -ну м.

ЛЕНТ//А - стужка, -кі ж; ~ОЧНЫЙ - стужачны.

ЛЕСОХИМИЯ - лесахімія, -міі ж.

ЛЕТУЧ//ЕСТЬ - лятучасць, -ці ж; ~ИЙ - лятучы; ~ий газ - лятучы газ.

ЛЕЦИТИН - лецыцін, -ну м.

ЛИГНИН - лігнін, -ну м; ~ОВЫЙ - лігнінавы.

ЛИГРОИН - ліграін, -ну м; ~ОВЫЙ - ліграінавы.

ЛИДДИТ - лідзіт, -ту м.

ЛИМОННОКИСЛЫЙ - лімонна-кіслы.

ЛИМОН//НЫЙ: ~ная кислота - лімонная кіслата.

ЛИНОЛЕУМ - лінолеум, -му м; ~ОВЫЙ - лінолеумавы.

ЛИПК//ИЙ - ліпкі, ліпучы; ~ОСТЬ - ліпкасць, -ці ж, ліпучасць, -ці ж.

ЛИОТРОПНЫЙ: л. ряд - ліятропны рад.

ЛИОФИЛЬН//ОСТЬ - ліяфільнасць, -ці ж; ~НЫЙ - ліяфільны.

ЛИОФОБН//ОСТЬ - ліяфобнасць, -ці ж; ~ЫЙ - ліяфобны.

ЛИПИД - ліпід, -ду м.

ЛИПОИДЫ - ліпоіды, - даў мн.

ЛИСТ - ліст, ліста м; л. железа - ліст жалеза; ~ОВОЙ -ліставы; ~овое железо - ліставое жалеза; ~овая сталь - ліставая сталь.

ЛИТ//ИЕВЫЙ - літыевы; ~ИЙ - літый, -тыю м.

ЛИТ//ОЙ - літы; адліваны; ~ая сталь - літая сталь.

ЛИТОСФЕРА - літасфера, -ры ж.

ЛИТОХРОМИ//РОВАТЬ - літахраміраваць; ~ЧЕСКИЙ - літахрамічны.

ЛИТР - літр, літра м.

ЛИ//ТЫЙ - літы; адліваны; выліваны; ~ТЬ - ліць; адліваць, выліваць; ~ТЬЁ - ліццё, -цця н; адліванне, -ння н; адліўка, -кі ж; выліванне, -ння н.

ЛИШ//АТЬ - пазбаўляць; ~ЕНИЕ - пазбаўленне, -ння н; страта, -ты ж.; ~ЁННЫЙ - пазбаўлены; ~ИТЬ - пазбавіць; ~НИЙ - лішні.

ЛОЖН//ЫЙ - 1. няправільны; памылковы; 2. несапраўдны; ~ые кристаллы - несапраўдныя крышталі.

ЛОКАЛЬН//ОСТЬ - лакальнасць, -ці ж; ~ЫЙ - лакальны; ~ый анализ -лакальны аналіз.

ЛОМ//ИТЬ - ламаць; ~КИЙ - ломкі; крохкі.

ЛОУРЕНСИЙ - лаўрэнсій, -сію м.

ЛУДИ//ЛЬНЫЙ - лудзільны; ~ТЬ - лудзіць.

ЛУЖ//ЕНИЕ - луджэнне, -ння н; ~ЁННЫЙ, ~ЁНЫЙ - луджаны.

ЛУНИТ - луніт, -ту м.

ЛУЧ - прамень, -мяня м; рентгеновские лучи - рэнтгенаўскія прамяні /промні/; ~ЕВИДНЫЙ - праменепадобны; ~ЕВОЙ - прамянёвы; ~евая болезнь - прамянёвая хвароба.

ЛУЧЕИСПУСКА//НИЕ - выпраменьванне, -ння н; ~ТЕЛЬНЫЙ - выпраменьвальны; ~ЮЩИЙ - выпраменьваючы.

ЛУЧИСТ//ЫЙ - прамсниы; ~ая энергия - праменная энергія.

ЛЮБОЗНАТЕЛЬН//ОСТЬ - цікаўнасць, -ці ж; дапытлівасць, -ці ж; ~ЫЙ- цікаўны; дапытлівы.

ЛЮИЗИТ - люізіт, -ту м.

ЛЮМИНЕСЦЕН//ТНЫЙ - люмінесцэнтны;~тный анализ - люмінесцэнтны аналіз; ~ЦИЯ - люмінесцэнцыя, -цыі ж.

ЛЮМИНОФОР - люмінафор, -ра м.

ЛЮТЕЦ//ИЕВЫЙ - лютэцыевы; ~ИЙ - лютэцый, -цыю м.

ЛЮТЕЦИТ - лютэцыт, -ту м.

ЛЯПИС - ляпіс, -су м.

ЛЯПИС-ЛАЗУРЬ - ляпіс-лазурак, -рку м.

М

МАГНЕЗ//ИАЛЬНЫЙ - магнезіяльны; ~ИТ - магнезіт, -ту м; ~ИТОВЫЙ -магнезітавы; ~ИЯ - магнезія, -зіі ж.

МАГНЕТИЗМ - магнетызм, -му м.

МАГНЕТОХИМ//ИЧЕСКИЙ - магнетахімічны; ~ИЯ - магнетахімія, -міі ж.

МАГН//ИЕВЫЙ - магніевы; ~ИЙ - магній, -нію м.

МАГНИЙОРГАНИЧЕСК//ИЙ - магнійарганічны; ~ие соединения -магнійарганічныя злучэнні.

МАГНИТ - магніт, -та м; ~ИТЬСЯ - магніціцца; ~НЫЙ - магнітны;~ная восприимчивость - магнітная ўспрымальнасць.

МАЗУТ - мазут, -ту м; ~НЫЙ - мазутны.

МАКРОКОМПОНЕНТ - макракампанент, -та м.

МАКРОКРИСТАЛЛИЧЕСКИЙ - макракрышталічны.

МАКРОМОЛЕКУЛА - макрамалекула, -лы ж.

МАКРОСИСТЕМА - макрасістэма, -мы ж.

МАКСИМАЛЬН//ЫЙ - максімальны.

МАКСИМУМ - максімум, -му м.

МАЛАХИТ - малахіт, -ту м; ~ОВЫЙ - малахітавы.

МАЛОАЗОТИСТЫЙ - малаазоцісты.

МАЛОАКТИВНЫЙ - малаактыўны.

МАЛОИЗВЕСТНЫЙ - малавядомы.

МАЛОИЗУЧЕННЫЙ - малавывучаны.

МАЛОИССЛЕДОВАННЫЙ - маладаследаваны.

МАЛОНАСЫЩЕННЫЙ - маланасычаны.

МАЛОУБЕДИТЕЛЬНЫЙ - малапераканаўчы.

МАЛЬТОЗА - мальтоза, -зы ж.

МАНГАНАТ - манганат, -ту м.

МАНГАНИТ - манганіт, -ту м.

МАНИПУЛ//ИРОВАНИЕ - маніпуляванне, -ння н; ~ИРОВАТЬ - маніпуляваць; ~ЯЦИЯ - маніпуляцыя, -цыі ж.

МАРГАН//ЕЦ - марганец, -нцу м; ~ЕЦСОДЕРЖАЩИЙ - марганецзмяшчальны; ~ЦЕВЫЙ - марганцавы; ~ЦОВИСТЫЙ - марганцовісты, ~ЦОВОКИСЛЫЙ - марганцавакіслы; ~ЦОВОРУДНЫЙ -марганцаварудны; ~ЦОВЫЙ - марганцовы.

МАРТЕНОВСКИЙ: м. процесс - мартэнаўскі працэс.

МАСКИРОВ//АТЬ - маскіраваць; ~АТЬСЯ - маскіравацца; ~КА - маскіроўка, -кі ж.

МАСЛ//О - масла, -ла н; смазочное м. - змазачнае масла; ~ЯНЫЙ -маслены; ~яная кислота - масленая кіслата; ~яные краски - масленыя фарбы.

МАСС//А - маса, -сы ж; ~ОВЫЙ - масавы; ~овая доля - масавая доля.

МАССОБМЕН - масаабмен, -ну м.

МАСС-СПЕКТРОМЕТРИЯ - масспектраметрыя, -рыі ж.

МАТЕ́РИЯ - матэ́рыя, -рыі ж.

МЕДЕПЛАВИ́ЛЬНЫЙ - медзеплаві́льны.

МЕ́ДИСТЫЙ - ме́дзісты.

МЕ́ДНО-КРА́СНЫЙ - ме́днa-чырво́ны.

МЕДЬ - медзь, -дзі ж.

МЕДЯ́НКА - мядзя́нка, -кі ж.

МЕЖА́ТОМ//НЫЙ - міжа́тамны; ~ное взаимоде́йствие - міжа́тамнае ўзаемадзе́янне; ~ное расстоя́ние - міжа́тамная адле́гласць.

МЕЖМОЛЕКУЛЯ́Р//НЫЙ: ~ное взаимоде́йствие - міжмалекуля́рнае ўзаемадзе́янне.

МЕЖФА́З//НЫЙ: ~ная грани́ца - міжфа́зная мяжа́ /грані́ца/; ~ное взаимоде́йствие - міжфа́знае ўзаемадзе́янне.

МЕЗОМЕ́ТРИЯ - мезаме́трыя, -рыі ж.

МЕЗО́Н - мезо́н, -ну м.

МЕЛ - мел, ме́лу м.

МЕЛАНИ́Н - мелані́н, -ну м.

МЕЛИНИ́Т - меліні́т, -ту м; ~ОВЫЙ - меліні́тавы.

МЕЛКОЗЕРНИ́СТЫЙ - дробназярні́сты.

МЕЛКОКРИСТАЛЛИ́ЧЕСКИЙ - дробнакрышталі́чны.

МЕЛЬЧА́ЙШИЙ - найдрабне́йшы, са́мы дро́бны.

МЕМБРА́Н//А - мембра́на, -ны ж; м. полупроница́емая - мембра́на паўпраніка́льная; ~НЫЙ - мембра́нны, мембра́навы; ~ный потенциа́л -мембра́нны патэнцыя́л.

МЕНДЕЛЕ́ВИЙ - мендзяле́вій, -вію м.

МЕНДЕЛЕЕВИ́Т - мендзелеяві́т, -ту м.

МЕНЗУ́Р//КА - мензу́рка, -кі ж; ~ОЧНЫЙ - мензу́рачны.

МЕНТО́Л - менто́л, -лу м; ~ОВЫЙ - менто́лавы.

МЕ́РА - ме́ра, -ры ж; м. беспоря́дка - ме́ра беспара́дку; м. безопа́сности - ме́ра бяспе́кі.

МЕ́РИТЬ - ме́раць, вымяра́ць.

МЕ́СИ//ВО - мешані́на, -ны ж; ~ТЬ - мясі́ць.

МЕСТОПОЛОЖЕ́НИЕ - месцазнахо́джанне, -ння н.

МЕСТОРОЖДЕ́НИЕ - месцараджэ́нне, -ння н, радо́вішча, -шча н.

МЕТА́ЛЛ - мета́л, -лу м; ~ИЗИ́РОВАТЬ - металізава́ць; ~И́ЧЕСКИЙ - металі́чны; ~и́ческая связь - металі́чная су́вязь; ~ИЗА́ЦИЯ - металіза́цыя, ~цыі ж.

МЕТАЛЛО́ИД - метало́ід, -да м; ~А́ЛЬНЫЙ - металаіда́льны; ~НЫЙ -метало́ідны.

МЕТАЛЛООРГАНИ́ЧЕС//КИЙ - металааргані́чны; ~кие соедине́ния - металааргані́чныя злучэ́нні.

МЕТАЛЛОТЕРМИ́Я - металатэрмі́я, -мі́і ж.

МЕТАЛЛОХИМ//И́ЧЕСКИЙ - металахімі́чны; ~ИЯ - металахі́мія, -міі ж.

МЕТАЛЛУРГ//И́ЧЕСКИЙ - металургі́чны; ~И́Я -металу́ргія, -гіі ж.

МЕТАМЕ́Р//ИЯ - метаме́рыя, -рыі ж; ~НЫЙ - метаме́рны.

МЕТА́Н - мета́н, -ну м; ~ОВЫЙ - мета́навы.

МЕТАФО́С - метафо́с, -су м.

МЕТИ́Л - меты́л, -лу м.

МЕТИЛАМИ́Н - метыламі́н, -ну м.

МЕТИЛЕ́Н - метыле́н, -ну м; ~ОВЫЙ - метыле́навы.

МЕТИ́ЛОВЫЙ - меты́лавы; м. ора́нжевый - меты́лавы ара́нжавы.

МЕ́ТОД - ме́тад, -ду м; м. вале́нтных свя́зей - ме́тад вале́нтных су́вязяў.

МЕХАНИ́ЗМ - механі́зм, -ма м; м. реа́кции - механі́зм рэа́кцыі.

МЕ́ЧЕ//НЫЙ - ме́чаны, зна́чаны; ~ные а́томы - ме́чаныя а́тамы.

МЕША́ТЬ - мяша́ць; ~СЯ - мяша́цца, зме́швацца; параме́швацца, зліва́цца.

МИГР//АЦИО́ННЫЙ - міграцы́йны; ~А́ЦИЯ - мігра́цыя, -цыі ж.

МИКРОВО́ЛНОВЫЙ - мікрахва́левы.

МИКРОГАЛЬВАНИ́ЧЕСКИЙ - мікрагальвані́чны.

МИКРОКОМПОНЕ́НТ - мікракампане́нт, -та м.

МИКРОКРИСТАЛЛИ́ЧЕСКИЙ - мікракрышталі́чны.

МИКРОКРИСТАЛЛОСКОПИ́Я - мікракрышталескапі́я, -пі́і ж.

МИКРОСИСТЕ́МА - мікрасістэ́ма, -мы ж.

МИКРОПРОЦЕ́СС - мікрапрацэ́с, -су м.

МИКРОСКО́П - мікраско́п, -па м; ~И́ЧЕСКИЙ - мікраскапі́чны; ~И́Я -мікраскапі́я, -пі́і ж; ~НЫЙ - мікраско́пны.

МИКРОХИМ//И́ЧЕСКИЙ - мікрахімі́чны; ~ИЯ - мікрахі́мія, -міі ж.

МИНЕРА́Л - мінера́л, -лу м; ~ИЗИ́РОВАТЬ - мінералізава́ць; ~О́ГИЯ - мінерало́гія, -гіі ж; ~ЬНЫЙ - мінера́льны; ~ьные удобре́ния -мінера́льныя ўгнае́нні; ~ьная вода́ - мінера́льная вада́; ~ьное ма́сло- мінера́льнае ма́сла.

МИНЕРАЛОМА́СЛЯНЫЙ - мінералама́слены.

МИ́НИМУМ - мі́німум.

МИЦЕ́ЛЛА - міцэ́ла, -лы ж.

МИЦЕЛЛООБРАЗОВА́НИЕ - міцэлаўтварэ́нне, -ння н.

МНОГОА́ТОМ//НЫЙ - мнагаа́тамны, шматата́мны; ~ные моле́кулы -шматата́мныя мале́кулы; ~ные спирты́ - мнагаа́тамныя спірты́.

МНОГОКОМПОНЕ́НТ//НЫЙ: ~ные систе́мы - многакампане́нтныя сістэ́мы.

МНОГООБРА́З//ИЕ - разнаста́йнасць, -ці ж; ~НЫЙ - разнаста́йны.

МНОГОЦЕ́НТРО//ВЫЙ: ~вая связь - многацэнтро́вая су́вязь.

МНОГОЧИ́СЛЕН//НОСТЬ - шматлі́касць, -ці ж; ~НЫЙ - шматлі́кі.

МОДЕ́ЛЬ - мадэ́ль, -лі ж; ~НЫЙ - мадэ́льны.

МОДИФИКА́ЦИЯ - мадыфіка́цыя, -цыі ж; м. аллотропи́ческая -мадыфіка́цыя алатрапі́чная.

МО́ЛЕВЫЙ - мо́левы.

МОЛЕ́КУЛ//А - мале́кула, -лы ж; ~Я́РНОСТЬ - малекуля́рнасць, -ці ж;~я́рность реа́кции - малекуля́рнасць рэа́кцыі; ~Я́РНЫЙ - малекуля́рны;~я́рная биоло́гия - малекуля́рная біяло́гія; ~я́рная ма́сса - малекуля́рная ма́са; ~я́рная фо́рмула - малекуля́рная фо́рмула;

~ярные комплексы - малекулярныя комплексы; ~ярные кристаллы - малекулярныя крышталі; ~ярные спектры - малекулярныя спектры; ~ярных орбиталей метод - малекулярных арбіталяў метад.

МОЛИБДЕН - малібдэн, -ну м; ~ИТ - малібдэніт, -ту м; ~ОВЫЙ - малібдэнавы; ~овая кислота - малібдэнавая кіслата.

МОЛЬ - моль, моля м; ~НЫЙ - мольны; ~ный объём - мольны аб'ём;~ная доля - мольная доля.
